*14.02.94*. Сижу на кухне, слушаю транзистор. Как всегда, в это время передают цыганские мелодии. Так грустно! Хотел было расплакаться, но представил себя со стороны (пол-первого ночи, холостяцкая кухня, поносно-желтые стены, тусклый свет электрической лампочки; уронив голову на стол, здоровенный мужик одиноко рыдает под цыганский романс) и передумал. Нужно хорошенько покопаться в шкафу. Может быть, ты еще что-нибудь забыла.

## МОЙ ПЕРВЫЙ МУЖ

В детстве я влюблялась в одноклассников, в техникуме — в одногруппников, позже — в товарищей по работе. «Это потому, что ты курица и домоседка, — говорит мой первый муж. — Романы нужно заводить в метро, в библиотеках, в филармонии...» Ну... филармония — это как раз его профиль.

Так вот, с Димой я познакомилась на работе. Мелькал такой высокий парень, лыбился, подмигивал. Я обратила внимание, что он постоянно к девкам клеится, и все время к разным; думаю, ладно, подмигивай, если глаз не жалко. К тому же — вижу, что парень явный поддавальщик, через день с мутным глазом ходит. В общем, я так... сурово была настроена... А он повадился заходить ко мне потрепаться, сходить пообедать вместе, покурить... У него — жена, дочка.

Однажды он мне заявляет: знаешь, я к тебе отношусь — как к лучшему другу. Все мои друзья — козлы; женщины, вообще суки, а ты — одна меня понимаешь...

Я рассказала моему первому мужу, а он говорит: «Смотри, как бы этот лучший друг не оказался однажды на твоем диване готовый к употреблению... Диван, он вообще способствует пониманию, как ничто другое...» А мой первый муж, он такой... Нострадамус такой... Накаркал, одним словом.

Представьте себе, три часа ночи. Звонок в дверь. Открываю, стоит Дима. Глаз мутный, колено нетвердое. «Можно — я у тебя переночую?..» Ночуй, говорю, тут ночевать-то всего ничего осталось. Утром он ушел на работу. Бледный такой, неразговорчивый. А вечером опять является, но уже пораньше, трезвый, в руках курица, мандарины. Так он у меня и остался.

Что касается секса, так я вам прямо скажу — ничего особенного. Я давно заметила, что если мужчина чрезмерно петушится по отношению к женскому полу, то там чаще всего или слишком быстрый секс, или слишком однообразный, весь пар уходит в хлопанье крыльями... Но мне было без разницы, я втрескалась, как последняя дура. Счастья полные штаны. Помните, как в песне Лаймы Вайкуле: «Ты — жаворонок, ты — жаворонок, ты — жаворонок, я — сова-а-а...» Дима был жаворонок, раньше меня

засыпал и раньше вставал. Вечером я подолгу сидела в кресле и любовалась на него, а утром он вставал первым, разогревал завтрак, будил меня...

Правда, мой первый муж предупредил меня (знакомиться с Димой он не захотел, мы только созванивались в то время), он сказал: «Как только твой хахаль начнет ныть, что его доченька растет сироткой, бей тревогу. Надевай эротическое белье, устрой ему режим усиленного питания, потому что парень смазывает салазки...» Я, дура, не поверила. А Дима действительно начал грустно смотреть в окно, вздыхать и рассказывать, что дочь растет сиротой, а у него такой трудный период, он даже деньгами не помогает, такой подлец...

И вот одним прекрасным зимним утром он ушел на работу и больше не вернулся. Причем, ушел он — мне в общем-то неудобно об этом рассказывать, но это так смешно, что не могу удержаться — ушел он в моем белье. Я все его исподнее с вечера замочила, а постирать поленилась. И вот он мне утром говорит: дай мне какие-нибудь трусы. Я ему отвечаю: «Если только мои».— «Да ты что? Как я могу?» Я говорю: «А что здесь такого? Ты разве собираешься где-нибудь раздеваться?..»

Ну он мои и надел. Я так смеялась, глядя на него... Интересно, как он от них избавлялся? Я знаю точно, что вечером того же самого дня он вернулся к жене. Не мог же он лечь в супружескую постель в моих трусах, где-то он их снимал? В подъезде, что ли?

Зато у меня есть коллекция Диминого исподнего. Иногда просматриваю, под настроение. Могу устроить вам экскурсию: «Трусы моей памяти...»

Я мужественно ждала день, два, неделю, месяц, а потом меня взяло такое отчаяние, что я позвонила моему первому мужу, он скоренько приехал, и мы, как в старые добрые времена, в четыре руки приготовили шикарный ужин, включили музыку... и нажрались в дребедан. Я рыдала у него на плече...

Мне все подруги говорят: ты — кретинка, ослиная морда, чего тебе не хватало?.. Мы с ним очень хорошо жили. Хорошо поженились, хорошо жили и развелись по-хорошему. Он сказал: я никогда не буду бывшим, я всегда буду твоим первым мужем. Я подумала: ну и ладно, лучше много разных, чем вовсе ни одного...

Мы бы и сейчас могли сбежаться. Ничто не мешает... Но...

Стоило мне увидеть Диму, далеко-далеко, где-то на горизонте, даже не Диму, а просто тень его, отражение, даже просто услышать звук его шагов, как у меня перехватывало дыхание, ноги становились ватными, и все остальное теряло смысл.

Многие женщины могут мне завидовать: я счастливая. Я знаю, что это такое, когда подкашиваются ноги от любви...

## ИСТОРИЯ, РАССКАЗАННАЯ ДМИТРИЕМ АНАТОЛЬЕВИЧЕМ К.

*(16 августа 1995 г., бар «Зодчие» — Берсона,3)*

...Давайте я расскажу вам свою историю, история такая... незатейливая, в общем-то, история...

Вышел я из школы. Иду. Было мне лет 7—8. Ну — девять от силы... Иду я мимо канавы. Точнее, канала. Такая длинная, протяженная канава. Канал. Иду. Гляжу. В канаве там — лед всякий. Край льда, вода плещется... К краю льда прикипела отдельно взятая льдинка. В льдинке — *нечто*!

Я наклоняюсь над каналом, пытаюсь дотянуться — ни фига! Наклоняюсь ниже — ни фига! Еще ниже, угол критический: ноги к туловищу, смотрите, показываю, меньше, чем 45° — естественно, падаю в воду.

А жил я, между прочим, на Севере. В Архангельске. Папа служил... Мама работала... Как говорила моя мама: северное сияние, это очень эротично... Так вот, зима — 35°. Я — в канале. Люди — в шоке. Собирается толпа. Я стою. Вода по пояс. Стою, думаю. Меня, наконец, извлекают.

Как вы думаете, что я делаю в первую очередь? Ну, с трех попыток. Начинаю плакать? Нет! Пытаюсь мысленно обсохнуть? Нет!

Правильный ответ: я снимаю ранец, а у меня на плечах — ранец, все, как положено. Снимаю ранец и проверяю —

НЕ ВЫМОКЛИ ЛИ ДНЕВНИК, ТЕТРАДКИ И УЧЕБНИКИ!

Каково?!. Думаете, конец истории? Ни фига! Слушайте дальше.

Я прихожу домой. Дома никого нет. Все с себя снимаю. Слабыми детскими ручонками пытаюсь выкрутить мокрое, в общем-то — безуспешно... Переодеваюсь в сухое и

СТАНОВЛЮСЬ В УГОЛ, ИБО МЕНЯ МУЧАЕТ ЧУВСТВО ВИНЫ!

Возвращаются родители. Видят меня в углу. Что? Как? Я объясняю. Родители в восторге. Целый вечер рассказывают по телефону знакомым, какой я клевый пацан (правда, теперь моя мама говорит, что я — сука, но это отдельная тема...).

Думаете, конец истории? Ни фига! Самое главное — впереди.

На следующий день возвращаюсь из школы...

Подхожу к каналу...

Кромка воды. Льдинка...

В руке у меня палка (обезьяна Павлова рыдала бы, глядя на меня!).

Палкой подгоняю отдельно взятую льдинку (внимательно слежу за равновесием собственного тела).

Подгоняю.

Достаю.

В льдинке —

замерзшая

*БАБОЧКА!...*

# ТАЦЦЯНА БАРЫСЮК



*Паэзія для мяне — катэгорыя экзістэнцыйная.*

*Мае вершы — гэта сведчанне майго існавання на свеце, апраўданне майго лёсу, адлюстраванне майго жыццёвага і творчага крэда, летапіс пачуццяў, біяграфія болю...*

*Народжаная ўвосень і штогод уражаная яе пышнай прыгажосцю і наступным яе скрушным агаленнем, люблю пісаць вершы гэтай парою.*



# ВОСЕНЬСКІ ПРЫСМАК НАТХНЕННЯ

* * *

Ёсць натхненне,
якое дае каханне.
Часам яно ўзнікае
ад захаплення прыгажосцю,
ад здзіўлення,
ад нечаканай думкі,
ад незвычайнай падзеі.
Але бывае, што натхненне
нараджаецца насуперак усім
неспрыяльным абставінам —
толькі таму,
што надышла Восень...

## ЭЛЕГІЯ КВЕТАК

***(Вянок напаўсанетаў)***

***1***

Кветкамі ўпрыгожваю свой шлях.
Ружы — успамін аб страсці першай,
імі так салодка наталяць
неспакой душы ў лятунках грэшных.

Горкую прыму наканаванасць.
Пройдзе час, і ляжа ў рукі мне
колераў і пахаў дасканаласць.

***2***

Колераў і пахаў дасканаласць,
сэрца жар мне абяцаў Нарцыс.

Верыла ў прывабную банальнасць
фраз і жэстаў, твару пекных рыс.

Лёс няўмольны раздзяляе нас.
Зіхаціць адхланнем на траве
сонечнай расы магічны бляск.

*3*

Сонечнай расы магічны бляск
на рамонках ззяе брыльянціста.
Можна ў варажбітку пагуляць:
мой пахмурны лёс ці прамяністы?

Бог не скажа, дзе ты, мой каханы, —
вечнай невядомасці праклён
на пялёстках спіць зачараваных.

*4*

На пялёстках спіць зачараваных
сонца — і не адарваць вачэй.
З завядзёнкі выхапіць нірвана —
ды на міг, каб свет зіхцеў зырчэй.

Мяту рву, чабор і зверабой.
П'янкі пах іх — пацалункам лета —
у журбе і ў радасці са мной.

*5*

У журбе і ў радасці са мной
кветкі пакаёвыя заўсёды:
амарыліс цвіў — была мілосць,
кактус і фіялка — да самоты.

Полымем, усёздзяйсняльнай зоркай —
цынія ўздымала мой настрой,
у каханні і ў самоце золкай.

***6***

У каханні і ў самоце золкай,
у надзеях-снах і ў паняверцы —
мроя чэрвеньскіх ружовых золкаў
зіхаціць маім разбітым сэрцам.

Прывіды мінулага са мной...
Мо загояцца калісьці раны
у душы — нябеснай і зямной.

***7***

У душы — нябеснай і зямной —
Бог з мужчынам у двубоі вечным.
Бог са мной — самотны супакой,
а мужчына — здраднік невылечны.

Зоркі астраў мой знішчаюць страх.
З думкаю «Per aspera ad astra» —
кветкамі ўпрыгожваю свой шлях.

***8***

Кветкамі ўпрыгожваю свой шлях.
Колераў і пахаў дасканаласць.
Сонечнай расы магічны бляск
на пялёстках спіць зачараваных.

У журбе і ў радасці са мной.
У каханні і ў самоце золкай.
У душы — нябеснай і зямной.

* * *

Віхрысты вятрыска
птушак пасе
і чытае газету
на асфальце.

Голуб са срабрыстай
ніткай на назе
ходзіць улетку
ў лапцях.

Апельсінавы спаніэль
скача па траўцы
ў пошуку дамы
сэрца.
Лета чароўную акварэль
хочацца бачыць,
музыка гамы
льецца.

Сёння за хаўтурамі —
шумнае вяселле:
лёсу мудрагелістая
ніць.
Радасна ці сумна,
вусцішна ці ўсцешна,
сэрцу амярцвеламу —
жыць.

* * *

Не сэрца — разбітае шкло,
на ім — твае ініцыялы.
Мінулае не адышло,
а будучае — не настала.
Адна... Бо мой кніжны свет
ад явы такі далёкі!
Расою блішчыць на траве
адчай прасвятлёных аблокаў.

* * *

Чаму натхненне без кахання памірае?..
Глядзіш, як яно курчыцца ад болю,

сцякае слязьмі і крыўдаю,
задыхаецца ад нежадання ўсвядоміць
сваю адрынутасць:
за што?!. За што?..
А як яму дапаможаш?
Стварыць ілюзію прысутнасці любага?
Закахацца наяве?..
Ды не хочацца зноў памыляцца, каб зноў балела.
Падумаеш пра боль — і сапраўды яго адчуваеш.
Татальная самота.
Ваяўнічая самота.
Самота дзеля самоты...

## РАНДО ДЗЯЎЧЫНЕ

Ад воч тваіх наіўных чараў
ён прыпадзе да тваіх ног,
знітуе вас жаданым дарам
кахання электрычны ток,
апаліць вашу кроў пажарам
Амур — такі капрызны бог.
І будзе сэрцам уладарыць,
хто тваю цноту перамог —
мужчына тваёй мары.

Быў Бог — цяпер глядзіць, як воўк.
Адчай застыг на тваім твары.
Яшчэ не выплаканы шок:
за што табе такая кара?
Як разлюбіць і кінуць мог
мужчына тваёй мары?

* * *

У найпакутнай экзальтацыі
асенніх мрояў — узгадаю

тэкст — белай фарбай на асфальце —
пад акном: «Цябе кахаю!»

Няхай радкоў праменіць пафас
і праясніцца каламуць,
каб здолеў верш зачараваць вас
і да мяне вярнуць.

* * *

Папялішча — і кветак жывучых буянне...
Вось таму і ўзнікае, мацнее, расце
прывід мары аб светлым, наіўным каханні,
ніягары высокіх пачуццяў-страсцей.

Што мужчынаў прыцягвае: розум ці цела?
За лісой паляўнічы па лесе імчыць.
На свабодзе бязмежнай я так адзічэла,
што нялёгка мяне прыручыць.

## ШЧАСЛІВАЯ СМЕРЦЬ

Шалею ўспамінамі хмельнымі,
выплёскваю думкі адчайныя
на воч тваіх стылую цвердзь.

Манон Ляско й Дама з камельямі
памерлі бязмежна каханымі.
Я мару пра гэткую смерць!

* * *

*Vulnerant omnes, ultima necat**.

Адчайныя думкі пачне хістаць
сусвет землятрусам быццам.

* Раняць усе, апошні забівае (лац.).

Як страшна нанова жыць пачынаць
у трыццаць!
Як сэрца пачвара чарговая зраніць,
каб не паміраць,
вучуся тады я жахлівую памяць
навекі сціраць.

## ГЛОСА

*Жывеш не вечна, чалавек, —*
*Пераҗывi ж у момант век!*
*М.Багдановiч*

Жыццё тваё — як дар багоў:
і крохкае, і моцнае,
сапраўднае і ўмоўнае,
у межах і без берагоў,
святое й поўнае грахоў.
І толькі, як бы ты ні бег,
цябе дагоніць ведзьма-смерць...
Тады адчуеш, небарака,
з'ільдзелы ад нямога страху:
жывеш не вечна, чалавек!

Каб вечным быць на злосць смярцям,
паэт свой верш шліфуе ўпарта.
Без жартаў — толькі гэта варта
рабіць, — а многім і няўцям.
Дні славы хутка праляцяць!
Каб не аддаць свой лёс на здзек,
каб адгукнуўся мноствам рэхаў,
паўстань! — і працаю штодзённай,
сваёй, натхнёнаю і плённай,
пераҗывi ж у момант век!

* * *

Велічная прахалода.
Дрэў перад сном агаленне.

Сэрцам маім авалодвае
восеньскі прысмак натхнення.
Гэтак духоўнага трэба!
Прывідных мрой акварэль.
П’ю рамантычнага неба
летне-асенні кактэйль.

* * *

Пачне паўстанне думак раць,
душу агорне сум былы,
каб сёння зноў магла кранаць
паэзіі нервовыя вузлы[**].
І зноў метафары звіняць,
не ў сілах сноў развеяць замець.
Сусвет мой зможа захаваць
мая машына часу — памяць.

## ПАЧАТАК КАСТРЫЧНІКА

Бывае восень — калі каханне,
калі душы палёт агністы,
тады наўздзіў цвітуць каштаны
і доўга зелянее лісце.
Бывае восень — калі самотна,
калі адчай так непазбежны,
тады слата або марозна,
а часам — нават снежна[***].

## 18 КАСТРЫЧНІКА

Калі мяне болей не будзе,
падыдзі да акна

[**] Гэты радок — паводле слоў А.Весялоўскага.
[***] У 2002-м годзе першы снег выпаў 8 кастрычніка.

і, спачуваючы слязам дажджу,
яго асенняму настрою,
узгадай пра мяне.
Або сонечным надвор’ем
у Траецкім ля Свіслачы,
гледзячы ў яе люстраныя воды,
успомні:
я калісьці таксама любіла глядзець
на дождж і на Свіслач...

* * *

Каб мары здзейсніліся, кажаш
замовы.
Замест асенняга пейзажу —
зімовы.
Як скруха сцісне твой сусвет —
слёзна.
Не знойдзеш лёсу запавет —
позна.
І пранясецца рой пакут
смерчам,
каб перадаць самотны дух
рэчам.

## ЖАНОЧЫ СМУТАК

Мы спрабуем, наіўныя,
зорнай мары не страціць,
плацім — часам і сіламі
за ілюзію шчасця.

І здароўем, і нервамі,
і слязьмі, і бяссоннем,
і сардэчнаю вераю,
і адчаем прадонным.

Каб не знішчыць ілюзіі,
мройных сноў не забрудзіць,

бо навокала людзі
ўжо даўно абязлюдзелі.

Донкіхоты ў музеях,
донжуаны ў фаворы.
Ды не гіне надзея:
«Знікнем разам», — гаворыць.

* * *

Калі за акном будуць енчыць вятры
і злавацца завіруха,
на кані да мяне прыскачы,
з ястрабам на плячы —
і кінь да ног чарнабурку:
«Для маёй яснавокай панны!»

* * *

Крыштальнасць росаў
гэтым ранкам
скамянелая.
Змяніла восень
залатое ўбранне
на вясельнае.

Сняжок істужкамі
паўзе
па голлі белым.
Чаму я з птушкамі
на поўдзень
не зляцела?

А можа, будзе
неба знак
на стрэчу з лёсам?
Тады абудзіцца

вясна
ў лятунках Восені.

* * *

Не прашу я, мой Божа, замнога:
мне, такой летуценнай — зямнога;
мне, такой імпульсіўнай — спакойнага,
на адкрытыя раны — загойнага.

Спадарожніка трэба такога,
каб трымаў рэчаіснасці ніць
і, калі буду страчваць прытомнасць,
каб паспеў ён мяне падхапіць.

* * *

Адвечны сум. І маразы заўчасна.
І памяць сэрца аб цнатлівым снезе...
Навекі страчанае шчасце
ўваскрэсне ў райскае кунезе.

І буду марыць аб адхланні
(хоць лёс расстанне нам прарочыць),
каб наша расцвіло каханне
і не змаглі яго сурочыць.

І Богу буду слаць маленні,
каб яркі імпульс стаўся вечным,
і ўрэчаісніў наша сненне —
сагрэцца полымем сардэчным.

* * *

Як стаць тваёй законнай жонкай,
любоўю, марай, птушкай сіняй:

завяяваць бясстрашнай амазонкай
ці адмаліць пакорнай Ефрасінняй?

Дайсці да самых сэрца нетраў,
быць неспатольнай, светлай Музай,
быць неабходнай, як паветра,
але не стаць табе абузай?

Нарэшце — веры даць мужчыну,
што можа верны быць каханню.
І быць Чароўнаю Жанчынай —
паводле сэрца і прызвання.

* * *

Расставайся, калі разлюбіў ён, — адразу,
аддзіраючы памяць з крывёю і мясам.

Не ўнушай сабе, што ён кахае і вернецца:
яго сэрца не раз яшчэ здрадай абветрыцца.

Не люляй сваіх мрой пра пяшчоту абдымкаў,
хоць і вусны твае да ягоных прывыклі.

Са слязамі сплыве настальгіі навала.
Ты ўяві, што сустрэчы той не існавала...

## ПАЭТЭСА

Тваё каханне — здрада
абавязкова напаткае?
Чаму нячастай госцяй радасць,
а лёс вымерваеш адчаем?
Ды сонечная раніца
абудзіць марай бэзавай.
Таму што ты — абранніца
Паэзіі.

* * *

Агонія апошняга кахання
цябе прыцягвае і старыць.
Насуперак душэўным прадчуванням,
расстаўся — каб званіць і марыць.

Узважваеш, якія маем шанцы.
Яна — адна ці не, — варожыш.
Сніш прыцягненне цел у танцы...
Расстаўся — а забыць не можаш.

* * *

Нарэшце, каб жыць — прабачаю...
Ляці прэч, ты — вольная птушка.
Тады ў зачараваным гаі
ты знойдзеш, з кім мроі пагушкаць.

А я — палячу да самоты.
Яна мне не здрадзіць ніколі.
За шчасця імгненнага дотык
не дам накановановай волі.

## ТАЦЦЯНА БЕЛЬСКАЯ



*Маё слова — мая зброя і мая абарона, мая слава і мой сорам. І калі ў мяне няма таленту, то я прашу ў Бога, каб Ён мяне адарыў ім. А калі ж талент у мяне ёсць, то я прашу ў Бога, каб Ён яго збярог.*

* * *

Радкі на паперы лягуць
слязьмі блакітных літар.
Соль іх не кожнаму бачна —
папера белая і соль — таксама...
Не заўсёды за вясёласцю
хаваецца шчасце.

* * *

Я — нібы кінамеханік, —
ірвуся адшукаць той момант
на кінастужцы майго жыцця,
дзе я і ты разам;
дзе ты жадаеш мець шчасце,
а я — маю шчасце.

* * *

Ты — як застыглы крок на асфальце,
дзе праходзіць маё жыццё.
Ты — сам яго пакінуў на свежым асфальце,
тады яшчэ дыхаючы прагаю жыцця.
Ты прайшоў па маім сэрцы
і зачыніў дзверы ў будучыню.
У нас засталася толькі мінуўшчына,
і тая — адна на дваіх.

* * *

Маё жыццё лягло на тваю паперу
тоўстаю рыскаю
майго вузлаватага почырка
і цягнецца па гэты час
крывавым болем безвыходнасці.

Мы залежым: я — ад тваёй паперы;
ты — ад маёй безвыходнасці...
А незалежнасць нашая
некуды знікла,
быццам бы яе і не было.
І няма нам чаго выстаўляць
рахункі:
мы ж — залежым адзін ад аднаго.

* * *

Слова — ты мой наркотык,
і мне не патрэбна іншага:
я — твой гаспадар і раб.
Папера, ты — дыханне чыстае
маёй душы,
скрэмзанае сінімі літарамі
маіх слёз.
Я — наркаман, які нарэшце
дарваўся да сваёй жадаемай дозы.
Я наталяю голад словамі вершаў,
каб душа займела імунітэт
ад жыццёвай будзённай пошасці.

* * *

Раней — на світанні майго жыцця —
я магла лётаць, як пушынка.
Але мінуўшчына вострым лязом
сваіх нажніц падрэзала мне крылы...
І цяпер я чакаю — покуль яны адрастуць,
з сумам пытаючыся ў самой сябе
і сваёй інтуіцыі:
— Ці змагу зноўку акунуцца ў акіян
світальнага блакітна-аксамітнага неба?
Ці змагу адмыць душу
ад бруду зямнога быцця

з яго туманна-абстрактнай мітуснёй,
з яго сумна-жудаснымі жарсцямі?..
А на траве блішчыць
росны россып маіх слёз,
што ўпалі на зямлю пацеркамі
цёплага дажджу,
і вясёлка ў небе, як сямікаляровая кветка
надзеі маёй душы, свеціць у вачах
тысячамі чэрвеньскіх сонцаў.
Мае крылы, не дайце мне памерці ад болю —
ад нязбыўнасці няспраўджаных мар.
Успомніце,
як вы насілі мяне ў паветры аптымізму
па-над будзённым нігілізмам грозных хмар.
Душа, памятай той інстынкт,
што робіць мяне чалавекам!
Падаруй сэрцу вышыню,
крылам — пах свабоды
і ўзнёсласць — ідэалізму;
душы — хоць сотую долю праведнасці,
розуму — яснасць, яе залатую сярэдзіну.

## СУМНА...

Памяць, спыніся!
Так болей жыць нельга!..
Усё, хопіць.

## МАРЫ

Ізноў маю душу апанавалі мары —
ірвуцца на яе палі, у яе лясы й абшары.
Лісце, падбітымі птахамі, падае на зямлю,
падбітымі камянямі кропель касога дажджу.
Косіць восень дажджамі рудую траву.
Ападаюць мары ягадамі спелай рабіны.
Я ведаю — праз зіму
яны ружамі зацвісці павінны.

## СЕЙБІТ

Пахмурнай вясною па полі прайшоў
Сейбіт.
Ён засееў поле майго сэрца зернем...
Зернем нашых слёз.
Заўтра мы — пажнем пах палыну.
А сёння — па маёй душы прайшоў
Сейбіт

## КАЛЕКЦЫЯНЕР ПАЧУЦЦЯЎ

Увайдзі па прыступках
майго жыцця
ў маю душу,
зазірні ў вокны майго сэрца.
Адчыні куфры маіх пачуццяў.
Ты бачыш золата, старыя дукаты,
алмазы й спелазялёны малахіт?..
Не! Ты бачыш цану маіх успамінаў,
маіх мінулых пачуццяў.
Ты сціраеш пыл з маіх куфраў
і шэпчаш:
— Шалёная вар'ятка!..
А я смяюся, бо я — не гандляр.
Я — калекцыянер пачуццяў!

## ПЛАГІЯТ?

Не паверыш? Я заплюшчваю вочы
й малюю сабе тваю душу:
гэта — возера, якое схавалася
ў вяршынях гор...
Возера б'е халоднымі крыніцамі віроў.
Пульсуе кроў венаў.
Дыхае і віруе вечным жахам вайны...
Я ж — хачу ўдыхнуць у яго
вечную прыгажосць міру і святла,

стаць тваім цёплым подыхам,
каб замерзлыя салаўі нашых мар
ажывалі ад лёгкага ўздыху.
Хачу стаць каралавым востравам
твайго возера — тваім сэрцам.
Так, тваім сэрцам... І ўжо ты сам
сабе не належыш. І ўжо мае думкі
становяцца тваімі. Мае дзеі — тваімі...
Гэта — не плагіят.
Гэта — усеабдымнае каханне!

## ТВАІМ ІМЕМ

Мая памяць — слайдавыя фотамалюнкі,
на якіх адбіваецца мая мінуўшчына,
лес успамінаў, у якім я хачу схавацца
і стаць рэхам, дзе толькі я выбіраю колеры...
Але ты сам назваў здраду сваім імем.

## ЭКАЛОГІЯ ДУШЫ

*Майму памерламу сябру*

Нас калыхалі мацяркі ў аднолькавых калысках.
Нам спявалі аднолькавыя калыханкі.
Мы гулялі з аднолькавымі цацкамі.
Мы хадзілі аднымі й тымі ж сцежкамі.
Аднолькавасць — ідыялізм нашых памкненняў.
А потым — узарваўся Чарнобыль,
і смерць адабрала ў цябе цела...
А можа, і добра, што памерла толькі цела
і Чарнобыль не забраў тваю душу?
Чыстымі засталіся яе нябёсы!..
Чарнобыль не ўварваўся ў твой розум —
смерць схавала ад тваіх вачэй
Чарнобыль Сучаснасці.

## У ПАРКУ

Прытулак, прыстанак —
ранак...
Вераснёвы вецер сярод альтанак
плача тугою чайкі.
Тут разбіваліся сэрцы
й б•яліся злыя байкі...
Ілгалі вусны — вуснам
вясною спакуснай.

* * *

Мы разышліся ў розныя бакі,
а паміж намі, як горкія вякі,
ляглі жыцця нашага берагі,
а над намі — неба блакітнага шаўкі.
Прадзе самотны дождж
нітку майго жыцця —
на пару з ім плачу і я.
На золку спевам салаўя
ірвецца з цела прэч душа мая.
Горкім рабінавым сокам
сэрца крывавіць між вячэрніх аблокаў.
Ранак майго шчасця,
які ты далёкі —
як бусел у небе высокім!

* * *

Боль майго сэрца — ты!
На тым канцы зямлі,
схаваўшы самотныя гарады,
белым абрусам ляглі снягі.
Боль маіх думак — ты!
Ссутонеў тугою вечар,
пахнуць зімы халады...
Павянчаўся з мяцеліцай вецер.

* * *

Сонца сілай Агню
шэпча зямлі: «Люблю!..»
Сілаю Вясны
ўплятае ружы ў мройныя сны.
У пакоі мы не адны —
на акне цалуюцца галубы.
Эх, Вясна-бессаромніца...
Сонца — каханка, яго палюбоўніца!
На вуснах тваіх —
яго сунічныя пацалункі...
Не хавайся —
ад кахання няма паратунку!
Раніцай трава пахне расою —
даражы, дзяўчына, сабою:
у любасці шмат адценняў,
але нічога лепш няма
за колер белых адзенняў...
Упляці ў вянок белую лілею!
Толькі той кахае, хто чакаць умее.
Хто кахае цябе — дачакаецца!
Лепш чакаць і трываць,
чым зняславіцца...

# АЛЕГ БЫБ



*Спросили: — Зачем пишешь стихи?*

*Подумал: «Неужели стихи так плохи, что по ним самим этого не видно?»*

*Ответил: — Чтобы не задохнуться.*

*Удивятся: «Что, как в молодости, так и сейчас, когда тебе уже пятьдесят, все тебе душно и никаких сдвигов в твоем мировосприятии? Стоит ли так плохо кокетничать? Мир меняется, неужели не чуствуешь?»*

*Соглашусь: «Многое, что еще вокруг, кроме хлеба, подорожало, но появились спонсоры».*

*Добавлю: «Я пишу стихи для того, чтобы восполнить в атмосфере то, чего в ней недостает, под воздействием окружающей среды».*



* * *

Ничего не надо мне,
ничего не хочется...
Вполпьяна я нынче пьян,
жизнь туманом сочится
через юности накал,
где надежды пылкие;
через старости подвал,
где сдаю бутылки я.
И стекается сия
влажная история
в лужу капель бытия
возле крематория.

*1980*

* * *

Весна в чумазой фазе
во всех своих ручьях —
вериги жирной грязи
нависли на ногах.

Журча, ручьи несутся
вперед, и вниз, и вдаль,
и ниточка не рвется,
и им себя не жаль...

А я — больной и старый,
и мне уже не течь,
но музыке ручьиной
дано меня увлечь.

И я, такой бескрылый,
смотрю на тот карниз,
откуда так возможно
шагнуть вперед и вниз.

*1980*

## ЗА ТРИ ТЫСЯЧИ ВЕРСТ ОТ ТВЕРСКОЙ

Дождь идет и идет над Россией бездомною,
покрывая дороги глухою своей пеленой,
а за тучами — звезды на небе такие огромные
далеко-далеко, за три тысячи верст от Тверской.

Ветры листья срывают, срывают, такие осенние,
кроны рушатся, чтобы умножить в полях перегной,
а за тучами — звезды на небе, на это не годные,
далеко-далеко, за три тысячи верст от Тверской.

Что ты сеешь, Россия, своею рукою огромною,
что ты греешь своею горячей безмерной тоской?
А за тучами — звезды на небе такие безродные
далеко-далеко, за три тысячи верст от Тверской.

Купола и соборы пустые покинуты верою,
еле слышно играет надежды оркестрик глухой,
черт на нарах последним окурком поделится с ангелом —
далеко-далеко, за три тысячи верст от Тверской.

Марсельезу поют резистанты с акцентами разными,
среди прочих — наш, русский акцент, непонятный такой.
Ненавидел их Гитлер, хоть были они буржуазными —
далеко-далеко, за три тысячи верст от Тверской.

Под Мадридом, Бомбеем, Брюсселем, Нью-Йорком,
Бейрутом ли
лунным светом усталому глазу мерещитесь вы,
когда вечером поздним иду я по улице Горького —
за три тысячи верст световых далеко от Москвы.

*1982*

* * *

Я рад приветствовать вас, спекулянт Садко,
вы скоро будете в Бомбее на базаре.

До этой Индии чертовски далеко,
но вы пробьетесь, так как вы — бедовый парень.
Под ватерлинию грузите на баркас
мешки с мякиною и мегатонны кваса.
На кость слоновую меняйте этот квас
и пополняйте в кассе долларов запасы.
Торговка частная пусть бублики возьмет,
и пусть в пути она к вам присоединится.
На эту песенку вся Индия сбежится —
и там вся публика по ней с ума сойдет.
У моря синего полна штормами пасть,
вы с контрабандочкой-то будьте осторожней.
С царем морским — плохие шутки на таможне:
на дно морское можно запросто попасть.
А нехороший хулиганский атаман
забыть не может криминальные привычки —
ведь так и ждет, подлец, начать: «Сарынь на кичку!..»
Ну и начнется: «Пролетарии всех стран!..»
Сарынь на кичку — и пойдут хватать наличку
толпой голодной пролетарии всех стран.
Но вы, конечно, отразите их налет!
Я помолюсь за вас, как благонравный инок,
ведь тем и этим нужен эффективный рынок,
и чтоб — валюта и товарооборот.
Я уважаю ваш коммерческий талант.
Хотите взять с собой? Да нет, я вам — не пара.
Но я считаю: вы — способный коммерсант,
и дай вам Бог удачу и товары.
Эх, пиво пенное, зачем ты так горько?
Но хмель от горечи забористее даже.
И я приветствую вас, спекулянт Садко!
И я приветствую вас, купля и продажа!

*1987*

* * *

Я — внук мировой революции,
расстрелянной НКВД.

Век подмахнул резолюцию
и органы вставил в биде.

Чтоб не отстать от времени,
куранты назад спешат.
Полураспада рентгены
в горле моем першат.

Лубянка — дороже Красной
на рынке валютных идей.
Красная нынче — напрасная
самая из площадей.

Чтоб не отстать от времени,
куранты назад спешат.
Полураспада рентгены
в горле моем першат.

Кому тут нужны завещания,
кто тут для них человек?
Хотите, товарищ Ленин,
я вам устрою побег?

Охранники замысел чуют
и смысл обезвредить спешат.
Полураспада рентгены
в горле моем першат.

Я в двух шагах от визы.
Храм моей песни гол.
Взгляд опустивши книзу,
я с песней прощаться пришел.

Чтоб не отстать от времени, —
а это ж в последний раз —
полураспада рентгены
и злая соринка в глаз.

*1990*

* * *

Любая идея — не свята,
любая на ночь не права,
тогда оживает Вандея
и из лесу кличет сова.

Простившись с заблудшей святыней,
сказав ей спасибо за кров,
беру я соседские вилы
и в чащу шагаю на зов.

Когда же на горле у песни
ослабнет костлявая длань,
я брошу полночную птицу,
но только не брошу Бретань.

Не брошу стремленье к полету,
и вилы не брошу вовек,
и ту безнадежную веру,
что все-таки я — человек!

Я знаю, что в чащах бывает,
что небу нам нечем помочь,
но счастливы те, что взлетают,
хотя бы и в черную ночь...

*1980—1985*

* * *

Я не умею дышать вне мести,
в журнале прочел — это от обезьяны.
Месть стайных приматов — не дело чести,
а просто инстинкт такой окаянный.

Не хищник мой предок, я точно знаю,
но я вслед за ним задаю порой жару:

уж раз мне загрызли брата по стае,
значит, я должен мстить ягуару.

Душе моей строки Писанья желанны —
я оба Завета читаю влюбленно,
но тело и дух мой — от обезьяны,
и никогда мне не стать сотворенным.

Мне надо любить по словам Христовым,
хоть Бога любить хочу, а не бояться.
Но есть во мне рудимент хвостовый,
который мешает к Христу подняться.

Я должен любить держиморд и паханов, —
когда полюблю их, в мир явится счастье.
В церковь являюсь я злым павианом,
ну вот, я пришел... Допустите к причастью!

*2002*

## ПОСЛЕДНИЙ АВГУСТ

В лагере спортивном, в окончанье лета
волочило ветром рваную газету.
Домики пустели, сердцу грустно пелось,
не хотелось в школу, в осень не хотелось.

Жизнь кромсала крылья, урезала смету,
волокла надежду, как газету, в Лету.
Август моей молодости движется в исход,
не вернусь я в молодость на следующий год.

Не вернусь я в молодость вспыхнувшей мечты,
никогда с надеждой мне не быть на ты.
Не прижаться сердцем к раненой струне...
Будь счастлива, молодость, помни обо мне!

*1978*

## РЕКВИЕМ ПО ТАЧАНКЕ

Едут, едут по полю тачанки,
ветер треплет гривы у коней,
поп-расстрига давит под тальянку
про Байкал, тайгу и Енисей.

Едут Каратаевы Платоны,
Ванька Каин и Безухов Пьер,
Стенька в мармеладовском жилете
и бандиты — вовсе пьяных вер.

Пахнет воля бурей и набегом,
свистом пуль и грохотом копыт,
пахнет воля небом и полынью,
воля песней по полю летит.

Всем властям вас к стенке ставить надо,
белому ОСВАГУ, красному ЧК...
Поп-расстрига выдал под тальянку
про Байкал, тайгу и Ермака.

Вам, братва, еще — копать каналы,
тосковать и души класть в штрафных.
Хватит вам еще на вашу долю
строек, нар, пайков и часовых.

Хорь, Калиныч, Митька Карамазов,
Стенька мрачен: дайте, что ль, гульнуть...
Поп-рассстрига выдал под тальянку
про его вчерашнюю княжну.

Душат волю золотом погоны,
долго волю им еще давить...
Рыжий поп с расстрелянной тальянкой
не велел погоны полюбить.

Едут, едут по небу тачанки,
птица-тройка взмыла на дыбы!

Ширь-тоска шукшинская в тальянке —
уносите, кони, от судьбы.

*1980*

## МОГИЛА ТЕРРОРИСТА

Есть в Минске на Козлова, на кладбище военном,
неброская могила в немеркнущем огне.
Обычный серый камень горит, как вечный пламень,
и песню в сердце зажигает мне.

Листая старых книжек усталые страницы,
заглядывая в души убитых мятежей,
я прихожу послушать, о чем весною пахнут
цветы, всегда лежащие на ней.

И все было недаром, не зря и не напрасно,
раз есть о ком спеть песню друзьям в нелегкий час...
Могила террориста на кладбище военном,
которая сражается за нас.

Меняются сезоны, законы и резоны —
то ясно, то ненастно, то снова холода...
Мерцает над могилой с чарующею силой
пленительного счастья туманная звезда.

Как часто рвутся в пропасть все те, кто рвутся в небо
из кондовых, казенных российских тупиков,
когда страна Россия — то Каин, то Мессия —
выходит из привычных берегов.

В нелегком нашем мире, в недетском нашем мире,
где нету вечных истин, где предают друзья,
пускай добром помянет мальчишку-террориста
простая эта песенка моя.

Живет страна Россия на поле Куликовом,
покой нам только снится, а в яви — вечный бой...

Не снится только скачка чертовки-кобылицы
да та звезда над нашей головой.

На Пулиховской улице, на площади Свободы,
на поле Куликовом не всякий раз весна...
Танцует всадник медный,
прищурен всадник бледный —
подыскивает всадник скакуна.

И крутятся планеты, и ждут влюбленных где-то,
и светятся светила, не поддаваясь мгле...
Пока на белом свете такие есть могилы,
пока они бывают на земле.

*1983*

## ВИРТУАЛЬНЫЕ УЛАНЫ

Цок-цок, цок-цок, господа уланы,
цок-цок, цок-цок, Гродно и Сморгонь
не забудут ваши доломаны,
не забудут древнюю Погонь.

Пахнет в Минске от морей болотом,
старой гнилью прет от новых стен,
здесь вчера смотрел с портретов Сталин,
с них не взглянет инсургент Шопен.

Кто-то рубит москаля и пана,
кто-то рубит мировое зло...
Бить бокалы, но не пить стаканом —
вот такое ваше ремесло.

Выше к небу, господа уланы,
выше к кронам от слепых корней,
в этой спешке косинерской пешке
не догнать несущихся коней.

Цок-цок, цок-цок, Минск, Берлин, Равена,
Брест, Гавр, Лондон, город Веракрус...
Вот такая у Погони сцена
вне страны по прозвищу Союз.

Цок-цок, цок-цок, господа уланы,
цок-цок, цок-цок, Гродно и Сморгонь
не забудут ваши доломаны,
не забудут древнюю Погонь.

Цок-цок, цок-цок, господа уланы,
длите дальше, дальше ваш разбег...
Цок-цок, цок-цок — ваши доломаны,
цок-цок, цок-цок — в двадцать первый век.

*1987*

## АФГАНСКИЙ ЛЕС

Афганский лес в полночный час
шумит березовой листвой.
Впадает Волга в тот арык —
вон там, вон там, за той горой.

По склону катится поток,
срываясь в пропасть с крутизны.
И вдруг запел чужой солдат,
пришедший из другой войны.

Афганский лес в полночный час
шумит, как роща под Москвой.
Ее листва укроет нас —
вон там, вон там, за той горой.

Никто нигде чужим не рад,
и тот солдат — тому пример.
Горит, горит за той горой
его подбитый БТР.

Афганский лес в полночный час
затих над кровью пролитой.
Пусть окропит ее Аллах
водою волжскою святой.

Поет, поет чужой солдат,
течет его напев из вен.
Был у солдата дома фронт,
там до сих пор — без перемен.

Афганский лес в полночный час
блестит березовой корой.
Страна родная любит нас —
вон там, вон там, за той горой.

Нахмурил брови капитан,
вздохнул о чем-то лейтенант.
И разодрало коркой рот
чужое слово «муттерлянд».

Афганский лес шумит листвой,
ему в ответ — набат в крови.
И ранит насмерть нас с тобой
родное слово «шурави».

Афганский лес, глухой порой
укрой листвой, не выдавай.
Пусть перекрестится Аллах,
когда солдата впустит в рай.

*1983*

* * *

Повязана навек Лубянка с Пер-Лашезом —
есть общее теперь меж факелом и тьмой.
Повязаны теперь навек мечта с протезом,
теперь в мечту навек прицелился конвой.

Повязаны теперь навек Христос с Маммоной,
с Иудой — активист весьма передовой,
и исповеди суть повязана со шмоном,
как обезьяний зад с Христовой головой.

Молитва навсегда повязана с проклятьем,
как счастие для всех навек с моей бедой,
и лозунг баррикад о том, что люди — братья,
повязан навсегда с нуждою и враждой.

Всегда, еще в апрель, весна стремится в осень.
Всегда, всегда, всегда — в любой весенний миг
скрипят, как трель скворца, тачаночные оси
и тянутся на юг под журавлиный крик.

Конармии всегда отходят от Варшавы,
всегда, сходя с небес, застрянет Бог в дверях.
Повязаны теперь навек Христос с Вараввой —
навек им быть вдвоем в Его концлагерях.

Но сердце жаждет свет, а значит — антитезы,
но антитезы нет — гниет на культях бинт.
Бескрылая мечта, одень свои протезы,
пошли по тупикам искать наш лабиринт!

*1989*

* * *

Дело было не того масштаба,
и по почкам били не всерьез.
Били осторожно, били слабо,
чтобы не до ручки, а до слез.

А когда мне в этом кабинете
пальцами потрогали кадык,
то железный Феликс на портрете
подмигнул и показал язык.

А когда по темени ладонью
мне внезапно выдали ребром,
вниз с портрета потянуло вонью,
а потом — заблеяло козлом.

Признаваться предлагал мне третий,
со смешком в лицо пуская дым,
и козел резвился на портрете,
и козел смеялся вместе с ним.

Говорил заслуженный полковник
мне, звезде, вонючке и козе,
что мою европу, как звездовник,
разъевропят зеки в КПЗ.

Седина пошла паршой на шрамы:
«Я тебя жалею, молодой,
я жалею очень твоей мамы...» —
и звенел геройскою звездой.

И чтобы на фоне взвитых нервов
нанести по психике удар,
на ботинки наступал мне первый,
выдыхая винный перегар.

И чтобы не допускать плохого,
чтоб заблеван не был кабинет,
поступали мудро и толково:
отпускали в город на обед.

И хоть я в тот раз героем не был,
думаю, держался ничего;
и хотя с овчинку видел небо,
все-таки не выдал никого.

И когда судья полгода вляпал,
буркнул старший, покидая зал:

«Жаль, мой милый: будь у нас гестапо,
все б ты нам, мой милый, рассказал».

Не был я ни вор, ни динамитчик,
но, лояльность напрочь истребя,
бит был больно гражданин обидчик
прямо в кабинете у себя.

Что ж, от сердца надо пить лекарства,
если... выхлебал до дна.
Как цена расплаты за бунтарство,
валидол — дешевая цена.

Бог нам дал для драк сердца и жилы,
глаз для зренья и для правды глас.
Будет надо — пусть Он даст мне силы
выстоять и в следующий раз.

*1983*

# ГАННА ГАЛАВІНА



*Можа, калі-небудзь, можа, аднойчы*
*цёплымі стануць марозныя ночы,*
*успыхне зямля ад вясновага рання…*
*Толькі пакуль я рыфмую жаданні.*



* * *

Дах зямлі працякае.
На далоні чужых падваконняў
мне далоні цалуе бяздонне
з учарашнім запоем у зрэнках.
Крокі будзяць самотнае дрэва
і жывую ў парку істоту.
Недзе словы ёсць — «заўтра» і «потым».
Ну і што. Я — зіхоткая кропля,
дзе хаваецца водсвет ад вокнаў,
за якімі ты слухаеш дождж.

* * *

Як было мне дагэтуль ведаць,
што ў лапіку талай вады
хаваецца столькі неба.
І можна знікнуць у ім,
шукаючы пэўны адрас;
сустрэцца з сабой — былым,
з тым, чаго не атрымала.
Там водбліскі — твой і мой;
майго мне заўсёды мала.
І — дзіва: з таго не горка,
што недзе глыбока на дне
міргае падманная зорка.

* * *

У ямах метро і аркестраў
грае ружовая скрыпка
напятых трамвайных ліній,
антэнаў і тонкіх шпіляў.
На голас злятаюцца здані,
хто болей ужо не мае

нават сляпога бяссоння
і каліт• для апошняй,
няпэўнай пяшчоты ў вачах.
Трывога кудлатых аблокаў,
водар вільготных яблык
употай за цемрай сочаць —
будзяць марознай ноччу
водгук забытых струнаў.

* * *

— Вы адкуль прыплылі, караблікі,
з парусамі пажоўклага лісця?
— З таго саду, дзе спеюць яблыкі,
і няма з цішыні дзе выйсця.

Там зямля перавітая казкамі,
палыном і рудым неспакоем.
Жураўлiную, з жніваю ясную,
яе ўсю захапілі з сабою.

У цёплым моры знайшлі не адразу мы
ў апельсінавы край паварот...
І заходзяць твае фантазіі
ў мой, засыпаны кветкамі, грот.

* * *

З далоняў халодных кармлю,
як птушку намоклую, восень.
Чакаю,
хаця ніхто аб гэтым не просіць.

Шкадую —
няхай на свеце апошняя гэтая справа.
Дарую —
на іншае, мабыць, проста не маю права.

* * *

Лапы грэе ля самых дзвярэй зіма.
Хто такі пуховы да вокнаў прыбег?
Снег.
Ён таксама быў хатнім калісьці — даўно.
Спаў на печы — уцёк... І вяртаецца зноў.
Мне і снегу, калі хочаце спаць ля агню,
вы, каму зараз цёпла на свеце, —
верце.

* * *

Вось цяпер, у спакоі, я здольная на ўсё:
рабаваць і адорваць адзінаю фразай,
траціць срэбра пяшчоты й грэцца ў цяпле,
быць за гэта хоць з ценямі, моўчкі — адразу
потым крыжыкі ставіць на тонкім сцягне...
Толькі б нехта ўнутры, увесь наскрозь рэлігійны,
ад агіды знямеў і маліцца пакінуў
на гатычныя веі твае.

* * *

За сотняй вяртанняў з болю,
снегу, сляпых надзей,
даведаюся, што помню
толькі сутонне вей.
За невыносным грузам
таго, што заўжды было,
раптам адчую: баюся
толькі маўчання твайго.
На тонкай нябачнай грані
між сёння і заўтра — крок.
Калісьці травою стане
цела маіх дарог.
Штомомант сцвярджаць «даволі»
нарэшце стамлюся, але

рвануся ў пошуках волі —
убачу толькі цябе.

* * *

Што за гэта ўрэшце атрымаю —
колькі дзён кароценькіх... Аж смешна!
Высахлых дастану кепскіх вершаў
для таго, каб моўчкі іх схаваць?
Гораду пакінуўшы палац,
боязь цемры, снегу, шэрых гмахаў
і сляпы давер вясновых дахаў, —
як бяссонне, гэта ўсё міне.
Застанецца што і будзе потым?
Тая незнаёмая істота —
у люстэрку насупр•ць мяне.

* * *

Чуеш шолах вясновых дажджоў,
шэпт празрыстых і цёплых лістоў?
Твар зямлі ён заліў і далоні,
валасы, вочы грудзі й скроні.
Слаўся, першых залеў цішыня
і напружаны шал дзікіх сноў,
нараджэння і смерці гульня!
Песці, дожджык, яе. Болей, болей!
Спевам птушак ускрыкне зямля.

* * *

За маёю форткай птушкі
вучацца, як пець не трэба.
Заціскае вушы неба
ад упартых, п’яных пальцаў.
Нават цішыня глухая
ў сполаху кудысь знікае —

толькі мне ці важна гэта,
калі я іграю танга.

* * *

Горад — маленькія келіхі,
споўненыя жаданнямі,
няпраўдай чужой і ціхімі
заўтрашнімі спадзяваннямі.

Вачэй цеплыню з горыччу
размешвае цемра сіняя.
Разбіцца так лёгка, ведаю,
на тонкіх трамвайных лініях.

* * *

І здарыцца — калісьці тое ўбачым,
што дараслі адзін да аднаго.
Пакінем у мінулым без астачы
слабыя вобразы, пабляклае святло.

З гадзіннікавых стрэлак хмельны водар
сцякае ад нясцерпнае вагі.
Але аднойчы, нібы ўласны гонар,
нам стане кожны момант дарагі.

І спынімся, дыханне затрымаем,
другога сэрца ўраз адчуўшы рытм.
І, быццам перад вечна неспазнаным,
мы схілімся з павагай перад ім.

* * *

На плячах самотных дрэў
і травой зарослых вуліц
застанецца шэры снег,
а мы пройдзем, дзе цяпло

сінь пад ногі перакуліць,
па дарогах мокрых стрэх —
за барвяным горкім сонцам,
вогнішчаў, надзей і грошай.
Зарыпяць у цемры колы.
Хусткай бруднай шэрых плошчаў
горад захінецца голы.
Пойдзе ўвесь — і шкло і камень —
заўтра пашукаць другое...
Шлях, прапахлы палынамі,
быццам ад сляпога болю, —
як заўсёды, разам з намі.

* * *

Над цёплым морам — дождж.
І хвалі ад жадання,
і кроплі ад усмешкі
мне не адрозніць болей.
Займеўшы надта многа цеплыні,
я падаю на дно пустога неба
і захлынаюся —
таму што немагчыма
чужым паветрам дыхаць.
А са шчакі — сцякае дождж над морам.
Мае жаданні — проста ціхі водгук
прыбою, выпітага тонкім слыхам
маленькай ракавінкі:
унутр — не патрапіць.
І застаецца толькі здагадацца,
як недзе ў глыбіні шапоча
над цёплым морам дождж.

* * *

Толькі тонкая постаць сляпога дажджу
нас сустрэне на вуліцы, мокрай і соннай,

каб употай правесці праз тую мяжу,
мураваную з кожнага боку па-свойму.

Тэлефона маўчанне ці водбліскі шкла
або холад адключаных батарэяў,
падштурхнулі на пошукі кроплі цяпла
ад сумненняў і памяці, што адагрэе.

Да вакзальных агнёў не вяртацца назад —
я не буду затрымліваць стомленасць ранку.
Постаць горкіх дажджоў застанецца стократ
даражэйшай за ружы паветраных замкаў.

* * *

Адкуль цеплыня
ў гэтых вачах і далонях?
Яе там не можа быць
ні сёння, ні заўтра — ніколі.
Не можа быць сноў,
шматкроп'я ў сказе з крокаў.
Ні горычы палыну,
ні веры расчыненых вокнаў.
Не можа быць дабрыні,
літасці ды павагі
там, дзе пануе шал
сляпой, неспатоленай смагі.

* * *

Падаюць яблыкі ў сад —
у недаспелы верасень.
Па асфальце, зямлі, верасе
коціцца яблыкапад.
Вось дык салодкі зман:
рукі шырэй убакі —

восень святла медзякі
міласцю кідае нам.
І прадчування смак:
ці ён калі пытае?
Слодыч ці золь нямая —
вось, у маіх руках!..
Яблык з зямлі падбіраю
гарачаю даланёй —
прапахлы дажджом, крапівой,
цемрай і трошкі раем.

* * *

Не пойдзе снег, калі апошняй хваляй
дрыжыць пад пальцамі мядзянае паветра,
пакуль на дне завулкаў дрэвы паляць
прытоеныя казачныя лямпы.
Што я жадаю? Менш за ўсё спакою.
Прасіць і верыць — для святых занятак,
а нам не засталося за гульнёю:
ні мне — цярпення, ні табе — спагады.
За проігрыш — трымай маё дыханне.
Успышку горычы — за адчуванне меры.
Не пойдзе снег, пакуль стрыптыз танцую
чарнілам на абвугленай паперы.

* * *

Адракаюся. Усё былое
пераходжана, як зямля.
Пералётнае дзікае слова.
Перасоленая цішыня.

Лісце пераапранута сень,
перасычана гарачынёй...
Толькі ты памылкова застаўся
так і непералюблены мной.

* * *

Я не п’ю горкай моцнай вады
і гарачай цвярозай кавы.
Я проста не п’ю.
Холаду не люблю ў халады,
скразняку — па вясне,
Гарачыні ўлетку я не люблю.
Шкодныя — цемра, агні і сум...
Мне самотнай быць проста нельга.
Нельга ведаць макрэчу дажджу,
а тым больш — несапраўднасць неба.
Вась яно маё сонца — лямпачка.
І ружовы пакой...
Асцярожней з такою лялечнай
і сапраўднаю мной.

* * *

У бурштыновым шкле маіх вачэй
адбіліся, чаго даўно не помню:
начныя паляванні, а яшчэ —
над пірамідамі егіпецкая поўня.

Што даражэй у свеце больш за ўсё
пасля маіх сагрэтых лапак белых?
Не ўсход і захад, порт і адплыццё —
агонь каміна, залаты ды спелы.

Узімку — дарагая цеплыня.
Хай мае словы — вуркатанне коткі.
Узамен таго, чаго жадаю я, —
усё, што ты захочаш, мой салодкі.

* * *

Я прачынаюся з табой ці без цябе:
і мне не лепш ад гэтага ні горай —

ну, можа, толькі трошачкі зусім...
Я гэтак жа п’ю каву і дажджы,
бываю і шчасліваю, і хворай.
І гэтак жа люблю, як пахне дым.
І п•даю ў вачэй жывое мора.
І гэтак жа не даражу былым,
хоць больш не злоўжываю цеплынёй.
Але яшчэ мацней трымае воля —
ушчэнт выпальвае святы спакой.
Не даравацць і не забыць ніколі,
што ўмею прачынацца не з табой.

* * *

Можна — мне сёння сумна будзе
ад таго, што ёсць дождж і людзі,
а ў кватэры няма агню?
Калі я нават плакаць буду,
то прыдумаю казку пра цуды,
што забылі маю зямлю,
калі восень крадзецца ўпотай.
Можна, вып’ю чужую пяшчоту
і растану ў экранным шкле?
А калі мяне ў сне сагрэе,
што — сказала б, але чырванею...
Можна, успомню тады пра цябе?

* * *

Шкадаваць ні пра што мне даўно не варта—
у валасах вецер гладзіць медзь.
Дзе яно, мае цёмна-барвовае заўтра?
Я жадаю яго сустрэць.

Дзе яны, патаемныя, цмяныя сходы,
паміж сёння і заўтра ніць?

Ці ў жалезнае зоркі крыжацкіх паходаў
навучыліся так любіць?

Усё адно: ці вясна, ці сляпая восень,
ці рамонкі, ці змрочны дым —
як світанне, як час, быццам неба просінь,
я прымаю цябе любым.

Каб пасля за краіну дажджоў, за слодыч,
як не раз адплаціў ты сам,
аддаваць (але потым упарта помніць)
ціхай вернасцю іншым багам.

І таму, хай пакуль яшчэ п'ю твой голас,
непазбежна гарчаць на дне:
прадчуванне, жаданне, але і боязь
майго заўтра — пасля цябе.

* * *

Не трэба мяне ратаваць:
я не тану, я — плачу.
Пакіньце мне сіні снег,
пакіньце пусты пакой.
Не трэба мяне шкадаваць —
яшчэ ўсё будзе іначай,
ізноў я шчаслівай буду,
наіўнай і трошкі злой.
Не трэба са мной да дна —
нашто вам, скажыце, ведаць,
як доўга мяне любілі.
І хто вінаваты ў тым
з часоў, як была вясна?..
Я блытаю смех і смеласць —
не трэба са мной так блізка:
мне помніцца горкі дым.
Ні праўду, ні зману гладзь,
ні ўпотайкі і ні звонка

я не жадаю болей
ні шэрані, ні суніц...
Толькі б змаглі прыняць,
як стомленага дзіцёнка,
трымаючы моцна-моцна
ў час гулкіх начных навальніц.

* * *

У гарачага лета на самым дне
і ў зімовым холадзе — мінус дваццаць.
Усё роўна будзем любіць сябе,
усё роўна будзем сябе баяцца.

Гулка б’ецца паветра густых дажджоў
аб ліхтар, патрабуючы сонца болей.
Нават ціхае рэха няўмольных слоў
мае смак несцярпіма салодкі — ніколі.

Як бліскучы й востры адбітак шкла,
заціскаю час даланёй употай.
Асцярожна ўсё-ткі мяне знайшла
чарапашая гэта пяшчота.

* * *

Толькі нікому — сёння.
Толькі нікому — заўтра.
Можа быць, гэта — горыч.
Можа быць, гэта — праўда.
Толькі ніколі — сёння.
Заўтра тым больш — ніколі.
Можа быць, гэта — гонар.
Можа быць, гэта — воля.
Прага не бачыць твару:
што мне цяпер і потым —
там, дзе расце агіда,

там, дзе была пяшчота?
Хочаш, хай будзе восень,
холад і невяртанне.
Толькі не паўтарэнне.
Толькі не дараванне.

* * *

Надзеі моц і смагі слабасць
адплаты патрабуюць зноў.
Сярод пухнатых ліхтароў
так лёгка пакідаць і вабіць.

Ўсевавілонскі слоўнік моў
не здольны растлумачыць мне,
што снег — заўжды цяпло на дне,
што боль — пакінутая радасць.

# ІНЕСА ГАНКІНА



*Творчество — процесс крайне субъективный, диктуемый умной эмоцией. Главное — найти интонацию, соответствующую внутренней мелодии.*

*С другой стороны, поэзия — это не «что», а «как». Потому крайне важна образная система, структура и внутренние связи, логические кульбиты, столкновения слов, понятий, культурных смыслов.*

*Это — не поза, а позиция, диктуемая особенностями психологического портрета, образованием и сферой деятельности.*

*Есть ли у такой поэзии читатель?*

*Надеюсь, что есть, раз представляю фрагменты творчества на этих страницах. Я заранее благодарна читающему за опыт понимания.*

И.Ганкина

* * *

Ваши тюбики с визгом порхают по небу.
Ах, душа улетит, ничего не оставит.
Там, у солнца, трещат обгоревшие пальцы.
Здесь — на цыпочках батик колышет доверье.
Так опасно соседство меж дверью и дверью.
Этот хаос сегодня уступит победу,
улыбаясь затылком на долгую память.

* * *

Белые скалы на синем пространстве,
старое море избыточных странствий.
Белые мраморы, серые плиты,
город, видавший иные орбиты.
Солнце, кричащее что-то родное.
Белые скалы — межмирное море.
Я постоянство твое ощущаю.
Полузнакомая, получужая
речь временами царапает горло.
Солнце живое над городом мертвым.
Если колонну потрогать рукою —
тело уснет в колыбели покоя,
и возвращенье покажется лишним.
Можно застрять, словно косточка вишни…
Белые мраморы, яркое солнце.
Жизни на донце и смерти на донце.

*16.07.2001, Турция*

* * *

Уклончивая гибкость бытия
у ивы, и шуршащая струя
меж веток оставляет брызги солнца.
Сухую кожу ветром веселя,
выглядывает девочка в оконце.

И свет и тени поровну деля,
ленивый кот с упрямыми ушами
свой собственный портрет являет в раме.

*Июль, 2001*

* * *

*Памяти еврейских общин*

Лягушки, лопухи — их предков видел Бялик.
Стена крошится желтою звездою.
Коза лопочет: «Слушай, о Израиль,
твои рэбэйным смолоты судьбою».
Мои следы не сохраняют плиты,
нет таковых в забытом Богом месте.
Твои потомки на иных орбитах
прилежно ходят к самым скорбным мессам.
Капусте хорошо расти на пепле.
Хрустит мальчонка свежей кочерыжкой.
Мои глаза от желтого ослепли...
И пахнет хлеб заплеванным кладбищем.

*Воложин, 2001*

* * *

Мой завершенный круг
за горизонт уходит.
Это случится вдруг,
словно на огороде
сядет тарелка из
огненного пространства.
Здравствуй, моя душа,
что, воротясь из странствий,
мне передаст привет
от старика из Книги.
Властвует не спеша:
что ему наши сдвиги?

Время течет назад,
радугой замыкая
неких страстей разлад.
Пенятся реки Рая
от пузырьков души,
что опьянили Бога.
Райские шалаши
выглядят так убого.
Не потеряешь Рай —
не обретешь дыханья.
Горечи через край,
в дереве — червь познанья.
Круг обретает твердь
и, притворясь Землею,
вверх запускает сеть
с солнцем над головою.
Этот гамак души
дал ей такие крылья.
Родненький, не спеши,
дай насладиться былью.
Пенится гладь Земли,
путь не находит сердце.
Звезды пылят вдали,
веник венчает скерцо.
Уж припасен финал,
тема найдет решенье.
Милый, как ты устал —
жертвой на воскресенье.
Чтоб прокормить кого?
Хлебом или стихами.

Тенью над облаками
Рухнуло божество.

## РЕКВИЕМ ПО НЕРОЖДЕННЫМ

Текущее стекло —
извечною змеею.

Холодное тепло
обнимет нас с тобою.
Вино — согреет взгляд.
Вина — укроет душу.
Каких ушей парад
молчанье это слушал?
Молчанье пустоты,
когда месили тесто.
Молчанье наготы
кровавого оркестра.
Уж третий вострубил,
да кто его услышит?!.
Молчание пальбы —
не громче писка мыши.
Молчание судьбы
у века на закорках.
Молчание рабы,
засевшее в подкорке.
Текущее тепло
истаявших Бастилий.
Прозрачное стекло
ожившего в могиле.

* * *

Солнце уходит,
затылок пушисто-горячий
миру являя.
И ночь приплывает со звоном
блюдца луны.
Чай остывает,
а небо совсем загустело
горькой заваркой.
Душе одинокой отрада —
в плотном безмолвии,
сон положив под подушку,

слушать тишайшую нежность
шагов ускользнувших,
в лодке тумана
встречать неизбывное завтра.

* * *

Где в белом пространстве души
безнадежно-прекрасный автограф,
в нем графика ночи распишется
веткою древа по белому снегу.
А кто-то сквозь чащу созвездий
несет чашку темного кофе.
И руки твои колыбельку качают лунёнка,
и что-то в затылок нам дышит —
возможно, чертенок.
А мир возвратился к началам
хрустящих пеленок.
Носящийся над белизною
пленительный дух,
как случалось иною порою,
все набело пишет,
и новое солнце
уже проступает над миром —
как гуща на донце.

* * *

Меж черным и желтым качается капля...
Судачат коровы, мурлыкает цапля
антенны, а впрочем, судьба безрассудна
и где-то в Европе бредет беспробудно.
Меж летом и летом сквозит промежуток,
от белого снега теряя рассудок,
уходит дорога от неба до неба
кусочек тревоги закусывать хлебом.

И каплей надежды баюкая душу,
меж желтым и черным... Ты только послушай.

* * *

У кружева кружение скрижалей,
закручен штопор, вздернут в небеса
собор, растущий по диагонали
от неба к небу. Через полчаса
минет столетье. Что ему, бедняге,
ломанье шапок, бредни королей,
когда кряхтят натруженные кости —
скелет весь обнажен, как на погосте.
Налей лекарство вечности скорей
из молодой и бесшабашной фляги,
что Фауст-панк забудет у дверей.

* * *

Нам на склоне приснится
дождливо-печальное небо,
и кораблик ракушки
одарит немыслимо белой
хрупкой чашей,
где горечи сладость росою на донце.
Я уйду в голубое сквозь черное
тонким побегом,
прорасту в бесконечность,
где нежится теплое солнце
на пушистом и мягком ковре
все познавшего вечного снега.

## ШЕПОТЫ И КРИКИ

### *1*

В овал вписал излом
извечный дух покоя и порядка.

И тает микросхемы шоколадка
под времени шершавым языком.

***2***

Парижский дождь картавит за окном.
Припадок дежавю, обноски вальса.
На шее века затянувши галстук
афиши: «Вечер русского романса»,
тапер заплачет. Шов на рукаве
топорщится, и пахнет телогрейкой
от мусорного бака. Во дворе
притихла суетливая семейка
больничных, все познавших голубей.
А санитар, ботинками пыля,
раздавит скособоченный рояль,
к нам забежавший из иного века,
где улица кончается аптекой,
а не решеткой памяти моей.

***3***

Круглится окно,
выгибая блестящую спину.
Мигнул абажур,
приглашая задумчиво в гости.
Ошметки скандала,
размокшие в лужице сплина.
У дверцы комода
скрипят постаревшие кости.
Французский каблук
и порхание шелковой блузы
в опасном кругу
гимнастерки, ремня, портупеи.
Иглу патефона заело, а страха медуза
из плесени времени тянет гусиную шею.

***4***

Промокшие ноги домов
наследили в новогоднем городе.

А всему виной —
загулявший дворник-мороз,
из мятого кулька Рождества
рассыпавший леденцы надежды.
Ах, устало-поникшие санки,
ждущие прошлогоднего снега.
Он растает в третьем тысячелетии.
А пока — длинные уши страха
торчат телевизионной антенной.
Я, пожалуй, запущу в экран
собранием сочинений.
Веселая кутерьма осколков
плавно осыпается молчанием.

***5***

Под Новый год смешно мечтать о лете.
Теряет стужа белые салфетки.
Простуда поперхнется амаретто —
и зачирикают под елкой дети.
Любовь истает прошлогодним небом
и уплывет по лужам к океану.
Бродячий вальс, подай кусочек хлеба,
напой трезвучье.
Обнищавший ангел
качается в кольце над головою
и передразнивает нас с тобою.

***6***

Я полюбила терпкий вкус
кофейни, сбрызнутой любовью.
Шуршащий мех старинных чувств
слегка изъеден жизни молью.
Петит печали на столе —
комок заплеванной газеты,
где натюрморт на винегрет
крошат и заправляют светом.

### *7*

Год начнется
мурлыканьем кошки голодной.
Здесь пространства
стекают окном запотевшим.
И качает надежда
фонарик безродный,
макаронины судеб
сплетая с усмешкой.
Этих дней мясорубка
вращалась не нами:
полоскались знамена
в кровавой лохани.
А у бронежилетов,
немыслимо голый,
легкий шарик души
оттопыривал полы.

### *8*

Шалый фонарь, утонувший в реке.
Лист обреченный.
Мир обезьянит,
зажав в кулаке ломтик лимона.
Желтым беззвучьем печали печать
вызвездит душу.
Бледная копия — плащ
на плечах века-втируши.
Вечное бабье — ступенек змея.
Скалятся двери.
Предосторожности небытия
после империй.

# ВАДЗІМ ГЛОБА



*Стихи – река; река жизни: стоит выйти на берег – и обратно дороги нет.*

*Нельзя плыть по течению и походить на всех, нужно стремиться против течения – и искать, и делать свое, новое, не похожее на прежнее...*



## КОЛЫБЕЛЬНАЯ ОТЦА

Над луной во сне летишь
мимо звезд, как будто снег.
Спи спокойно, мой малыш,
ты устал, а стрелок бег
зов кукушки замедляет.

Тихо в доме, даже мыши —
даже мыши засыпают.
Ангелы летят все выше,
крылья в небе расправляют.
Спи спокойно, завтра утром
ты проснешься взрослым, мудрым.
Спи малыш, лишь только дети...
Нет, не взрослые, а дети
в мире больше понимают,
про добро из сказок знают,
про тепло ладоней мамы —
в них не страшен самый-самый...
Самый-самый страшный сон.
Не позвонит телефон...

За окошком снег идет.
Мама больше не придет,
не заглянет в твои очи,
не шепнет: «Спокойной ночи...»
Только ангел за окном,
шелестя своим крылом,
сон твой чистый охраняет...
Мама помнит, мама знает —
мама здесь, всегда с тобой,
сохраняет твой покой
под серебряным крылом.
Мама в мире, но — в другом.

Ветер снег сгоняет с крыш...
Спи спокойно, мой малыш.

## ЗАПИСКИ ПЕССИМИСТА

Иду домой — боюсь.
Боюсь, что не вернусь.

Мне страшно каждый день —
хожу я, словно тень:

а вдруг на город завтра,
в канун восьмого марта,

падет метеорит —
и все вокруг сгорит?

Сломается диван.
Случится ураган...

Мой разум сразу ахнет:
«Коньяк клопами пахнет!»

## ЗАПИСКИ ОПТИМИСТА

Все будет хорошо — я знаю!
По морю плаваю, летаю.

На улице не слышно грома.
Меня весь день не будет дома,

Меня с работы не уволят.
Моя мольба грехи замолит.

Я солнце на ура приму.
И на ура приму луну.

Со мной плохого не случится —
моя душа в веселье мчится.

Дождя не видно за окном.
Клопы же — пахнут коньяком.

* * *

Любовь обходит все преграды.
Любви покорен стар и млад,
и нету более награды —
любовь! О, муза, как я рад!

О, чувство дивное, готов,
тебе отдаться покоренным.
Срывать с любви круги оков...
Хвала, хвала... Хвала влюбленным!

* * *

И вот весна — любви прозренье,
начало горестных обид.
Черпаю томно вдохновенье —
и сердце, как струна, звенит.

Любовь приходит не одна —
с ней муза, дарит вдохновенье.
Душа становится вольна —
горит все наше поколенье.

Тебе дарю я свои сны.
Тебе к ногам цветы бросаю...
И лепестками средь весны
тебе дорогу устилаю!

## АМОРФНЫЙ ПЕС

Четыре ящика портвейна
куплю сегодня и напьюсь.
И много сделаю глинтвейна...
Домой сегодня не вернусь.

И мне приснится сон аморфный —
больного разума порыв, —

в котором будет пес бездомный
скулить и лаять аж в надрыв.

Он мне расскажет о помойке,
где каждый день находит кость.
Он мне расскажет о той стройке,
где спит и летом и зимой.

И после этого рассказа
смахну слезу я со щеки.
Какая все же жизнь зараза —
бывает так, что хоть вопи!

Я посмотрю в глаза собаке,
ее на руки подниму.
Я отнесу ее в кабак и —
обедом вкусным накормлю.

И в благодарности за это —
она в лицо меня лизнет...
Вот и сейчас она ведь где-то
в стихии голода живет.

## БОГУ

Где ты: в покое черных ряс,
когда звонят колокола?
Когда весь мир в войне погряз,
и в каждый дом чума вошла?

А ты, забыл, ты бросил нас?
Где ты, когда здесь дьявол скачет?..
Бог на земле и возле нас,
закрыв лицо руками, плачет.

* * *

Не смотри на меня строго,
мама... Правда, я не пил.

Не ругай меня с порога —
с волком я на звезды выл.

Мама, что он мне поведал!..
Знаешь, что он мне сказал?
Раньше мир поганым не был —
он теперь поганым стал!

Волк сказал, что слышал где-то, —
может, ветер нашептал? —
что есть край, залитый светом,
правит где весна свой бал.

Где безумье — не известно.
Где любви — не ведом страх.
Но искать то — бесполезно:
это место — в наших снах.

Только их не так уж много —
на всю грязь не хватит снов...
Стала жизнь наша — жестока.
Стали люди — хуже псов!

## ЭТЮД

Полночный мрак... Деревья в трансе.
Не слышно шелеста шагов.
И звезды в сумрачном пасьянсе
застыли от ночных ветров.

И бледный свет залил все щели —
луна восторга лишена.
В домах забиты окна, двери;
ну а вокруг — лишь тишина.

Вот город: он — пустой, он брошен.
Забыт, покрылся пылью лет...

Он в одиночестве — ничтожен.
Лишь ночь бросает черный плед...

## СТОЛИЦА

Какие глупые часы:
все те же стрелки, та же полночь,
все те же брошенные псы
поют луне, зовут на помощь.

Эй, город, слышишь ли их плач?
Забудь про ночь, открой всем лица...
Не видя сотни неудач,
в огнях купается столица.

А что столице — все равно,
что я люблю, чего желаю;
что черно-белое кино
теперь пришло на смену рая;

что девушка моей мечты
в минуты эти не со мной...
А ты — поешь, смеешься ты,
разлившись огненной рекой.

## В ХРАМЕ

Святой отец, ему лет двадцать,
Христову кровь нам раздавал
и ROLEXом, рублей за ...надцать,
пред честным храмом гарцевал.

А все просили покаянье
за «страшные» свои грехи,
за «праздные» свои желанья,
меня толкая на стихи.

И вот пришла «святая» лира
под сумрачный, церковный хор;
и светом солнца озарила
весь этот православный вздор.

Смешно, коль не было б так грустно,
весь этот пафос, эта ложь
терзают то, что и так пусто,
вгоняют под лопатку нож.

Отцы святые в этом храме
застыли, книги теребя,
и каждый думает о даме...
Откройте храм внутри себя!

* * *

Разбросав себя до крупицы,
устав от огненных роз,
наблюдая за счастьем царицы
у ног ее валяется пес.

И ни жив, и ни мертв — неизвестно,
только уши прижавши, скулит;
вот ошейник его, его место,
и в груди его что-то болит.

Странный пес — ни наград, ни медалей.
И не ходит — только лежит
на заплеванном пьедестале,
омывая слезами гранит.

Все приходят сюда одинаково,
все приходят искать что-то;
совершая поступок знаково,
унижая себя для кого-то.

С неба падает каплями что-то,
на какую-то гадость похоже.
И поэты здесь для чего-то...
Ведь умирают поэты тоже?!.

* * *

Вот бутылка... Брошен на пол,
словно пепел сигареты.
Может, с горя я бы запил —
пил бы так, как пьют поэты.

Пил бы так, как пьют деревья
в знойный полдень летний дождь.
И читал бы откровенья,
как не здешний, будто гость.

## КРИТИКАМ

Вы за стихи мои простите,
И за безумный выбор слов
казнить меня уж не велите,
коль стих — как пение ослов.

Пусть — не талант я и не гений.
Пусть я — глупец, а не поэт.
Пусть я из бывших сожалений
пытаюсь выдумать сонет!

Но я пишу о том, что вижу.
О том, что знаю и терплю.
А врать о жизни — ненавижу,
и все, как было, говорю.

## КОГДА ОСЕНЬ

Когда стаи выгнутся клином,
когда станет на небе черно,

когда люди, пьяные дымом,
греют в стакане вино;

когда небо пасмурным станет,
из глубин его рвущихся туч,
траурным ветром потянет,
и овеет душевную муть, —

тогда завтра начнется сегодня;
листья с кленов разбросаны веером...
От безумия огненной осени
мне поможет посланница севера.

Тогда станет мой сад удобрением —
без цветов я приду к тебе в дом
поделиться своим сожалением,
и стихов принесу тебе том.

И в огне, словно ворохи листьев,
с чувством жалости и с удивлением,
позабыв о кощунственной лести
топишь печь ты моим вдохновением.

* * *

Когда любовь твоя жива,
когда любовь твоя взаимна,
касается крылом крыла, —
такое чувство, право, дивно.

Стихи твои без слезной соли.
И розы без шипов твои.
Шаги даются все без боли,
две силы сплетены в любви!

Ты видишь сны в лучах рассвета —
улыбка трогает уста,

но если чувство без ответа,
любовь, как и стихи, пуста.

Но стоит только обмануться —
и сердце жаром пышет вновь,
когда пылает не напрасно
в груди твоей огонь-любовь.

* * *

Вот бы — в небо бы.
Вот бы — к солнцу!
Вот бы — света бы
через оконце.
Вот бы — песен
небесного сброда —
только крики
слепого народа.

А от любви —
не дождешься ответа.
Губы в крови
без телесного света.
Есть иллюзорность
святого огня:
это на небе чего то там светит.
Жизнь для меня?
Мне ее не заметить.

Вот бы — в небо бы.
Вот бы — к солнцу!..
Вот бы — света бы
через оконце!
Только не в этом
поруганном мире!
Только не в этой
последней квартире!

* * *

Я, может быть, писал бы стихи —
была б ты хоть на метр ближе,
чтоб краем уха я услышал
твои чуть слышные шаги.

Писал бы, может, горячей,
тебя увидев краем глаза,
да на столе — пустая ваза,
да бесконечный ряд ночей.

Но только не найти покоя —
не вижу твоего лица...
Во мне есть много от глупца —
и не уснуть мне сном героя.

## ОСЕНЬ

Вокруг вдохновенья не меряно,
красивых рифм не счесть.
И дышится ровно, уверенно —
не греет ни слава, ни месть.

В грохочущем небе срываются
черные стаи на крик.
В осколки мечты разбиваются
и мысли заходят в тупик.

В ветвях всех деревьев слышаться —
песни, но песни сухи.
Что странно — стихи не пишутся...
Какие ж тут к черту стихи!

* * *

Одинокий черный котенок
возле дома сидит на земле.

Над котенком рыдает ребенок —
просит маму взять киску себе.

А что мама, что мама ответит?
Как же ей малышу объяснить,
что у кошек бывают дети,
что и кошек нужно любить?

Что вот эту смешную малышку
мама оставила ждать,
а сама побежала за мышкой,
чтобы мышку дочке отдать.

Мама взяла ребенка за руку
и по улице тихо пошла;
ее сердце щемило со стуком
и, наверно, болела душа.

А кто видел, как плачут котята?
Как из маленьких бусинок-глаз
льются слезы в четыре карата —
слезы чистые, как алмаз?

И котенок зальется слезами,
будет долго кого-то ждать,
Ведь он видел своими глазами,
как собаки загрызли мать...

* * *

Цветок к цветку сложи в букет —
все лепестки, как сотни радуг.
Пусть среди них один и гадок —
цветок к цветку сложи в букет.

Возьми букет и положи,
где я лежу, там — на надгробье,

пропитанного слезной скорбью...
Возьми букет и положи.

А впрочем, выбрось ты цветы —
пусть мчат ветра, рыдают грозы...
Цветы молчат, не льются слезы,
а впрочем — выбрось ты цветы.

## СКАЖИ

Скажи, полюбишь ты поэта?
А разве нужен он тебе?
Мечты, стихи; на все на это
найдешь ли место ты в себе?
Простишь ли ты его за то,
что он бросается словами?
А пожалеешь ты его
с его разбитыми мечтами?

# ЯНА ГРЫБАВА



*Пішу, каб жыць.*
*Жыву, каб пісаць.*
*Пішу, каб расказаць усім, што хвалюе, турбуе.*
*Не пісаць не магу, як не магу забараніць сабе жыць.*



# ВЫЯВЫ ДУШЫ

*1*

На пытанні ты ўжо не адказваеш, амаль нічога не гаворыш наогул. Нібы здарылася нешта такое, што ты не можаш усвядоміць, і ўсе твае разумовыя здольнасьці спатрэбіліся дзеля гэтай справы.

І штосьці здарылася з тваімі блакітнымі вачыма, з тваімі крыштальнымі ільдзінкамі, і смех стаў такім, нібы ён ідзе не ад сэрца, і нават не ад мозгу, а зусім аднекуль з левай пяткі. Дый увесь ты змяніўся — нават стаў мне непрыемны.

Так, калі я гляджу на цябе, у мяне на языку адчуваецца прыкры смак. Але што ж далей?..

Пройдзе год — і што застанецца ад цябе ў маіх успамінах? Толькі гук дрыготкага механічнага смеху, прыкры густ і чырвоны колер блакітных крышталікаў лёду.

*2*

Яму страшна.

А ці не было б страшна вам, калі б на Зямлі засталося ў жывых некалькі чалавек. І вы — адзін з іх?

Здаецца, не надта прыемна.

З горыччу прыгадвае ён дні, тыдні, месяцы, калі кожную хвіліну бачыў людзей, сапраўдных, сотнямі, тысячамі, і — як злаваўся на іхнія ўчынкі, і — як сварыўся з імі за кожную дробязь, і — як ненавідзеў.

Чаму?..

Чаму чалавек па сваім першасным складзе не цэніць тое, што яму дадзена, а свядома памятае аб гэтым толькі тады, калі гэта ўсё бясследна знікае?

Дый наогул — усё марна. Усё роўна ён спазніўся са сваімі высновамі. Разумець іх і прытрымлівацца ўжо няма каму.

*3*

Яны — тыя, хто распялі Хрыста. Яны... — тыя, хто забівае асобу, індывідуальнасць. Чалавека з вялікай літары.

Але яны — ніводзін з іх — ніколі не прызнавалі й не прызнаюць, што кроў — менавіта на іхніх руках, бо гэта быў натоўп, статак, дзе не вінаваты ніхто, але вінаваты кожны.

## *4*

— Раскажы мне пра каханне!

— Каханне?.. А навошта? Гэта такая збітая, зацяганая тэма, што ўжо не варта нешта казаць — столькі ўжо аб каханні сказана, столькі напісана!

— Усё роўна — раскажы.

— Каханне... Каханне — гэта, калі два чалавекі размаўляюць моўчкі, калі ўжо іншым няма аб чым маўчаць, а ў іх знаходзяцца тэмы для размоў. Каханне — гэта, калі пасля выбуху атамнай бомбы, закаханыя пытаюць адзін аднаго, ці не пабілі яны калені. Каханне — гэта, калі хочацца, каб сляпыя ўбачылі тваё шчасце, а нямыя — спявалі аб ім. Каханне — гэта, калі здаецца, што ад такога моцнага пачуцця, якое ты адчуваеш, можа патрэскацца неба ці ўвогуле ўвесь сусвет развaліцца на кавалкі. Каханне — гэта, калі хочацца крычаць глухім зоркам, што ёсць яшчэ ў свеце людзі вартыя яго, кахання.

## *5*

Я не памятаю нічога з таго вечара па зразумелых прычынах. Але з болю, які дрыжыць у маёй галаве, я вылучаю рукі, залітыя чырвоным... вінoм, якія злучыліся на маёй шыі й не даюць дыхаць.

Бо права дыхаць — гэта частка свабоды... А ты казаў, што мне нельга яе адчуваць. Праз некаторы час перад маімі вачыма пачынаюць складвацца, нібы з кавалкаў, твае, акурат намаляваныя, але калі б мяне папрасілі намаляваць іх, я не здолела б. Дый ніхто б не здолеў, напэўна. Мне пачынае здавацца, што яны наогул з паперы. Такія ж нязменныя — ніякае пачуццё нічога ў іх не закранае, але і такія ж нясталыя — варушацца ад кожнага ўздыху. Дый наогул, да цябе вельмі падыходзіць прыстаўка «не». Нават, кажучы пра пустую шклянку, ты, пэўна, скажаш — «няпоўная». А мне аніяк нельга казаць тое, што я хачу казаць, бо гэта — таксама свабода...

Цікава, а калі б я захацела памерці, скончыць жыццё самагубствам, то ты мне не дазволіў бы? Альбо — дазволіў бы павесіцца, бо ведаеш, што калі б выбірала я, то загінула б інакш?

Здаецца, ты згадзіўся б на ўсё, але каб гэтага не хацела я, бо даваць свабоду — тым больш мне — гэта не па тваіх правілах.

І пасля гэтага людзі кажуць, што не маюць свабоды?.. Згодная з гэтым: не маюць. Бо маленькая-маленькая статуя свабоды не зможа парваць ніводнай ніці няволі, з якой зроблены мы самі дый усё вакол нас.

### *6*

Слёзы, як кроплі растваральніку, падаюць на лакіроўку стала, і на ім застаюцца белыя кіслыя плямы. Яны не салёныя, бо соль ёсць толькі ў слязах ад болю, страху ці злосці, а гэта была — крыўда.

Крыўда...

Ён не меў права вось так знікаць. Знікаць у сонечным, але цёмным дні, знікаць у маленькую бясконцасць гэтага вялікага шэрага свету.

Крыўда...

Але і яна не мела права смяяцца яму ўслед, бо цяпер ён больш ніколі не вернецца. Але калі б яна плакала, ён бы ўсё роўна не вярнуўся.

Крыўда...

Ён не меў права ламаць яе. Папраўдзе кажучы, у яго гэта атрымалася, бо яе стол — у белых плямах, а не яго, і яна спрабавала рэзаць вены, а не ён... Бо ён бы змог парэзаць рукі толькі ёй, і ніколі — сабе.

Крыўда...

Так, крыўда. Але чаму смутак, скрыжаваўшы ногі, сядзіць ля яе парога? Магчыма таму, што ў яго няма таго парога, дзе можна было б пасядзець? Не, не таму. Проста ён — мужчына, яму нельга, сорамна і цяжка пакутаваць. Такая раскоша дазволена толькі жанчыне. І калі яна церпіць, а ён — не, то хто з іх — слабы пол?

Смутак... Можа, у яго няма таго парога, дзе можна было б пасядзець?

### *7*

Чырвоная вадкасць стаяла ў шклянцы на крайку стала. Ужо колькі дзён стаяла, і ніхто не заўважыў гэтага паціху гусцеючага

рэчыва. А можа, проста чырвоны колер на фоне белага абруса надаваў шклянцы асаблівы сэнс?..

І ўявце сабе, што калі амаль праз тыдзень нехта не наўмысна ўсё ж такі штурхнуў шклянку, то ад ярка-чырвонай плямы пайшла пара, бо гэтая вадкасць ніколі не астыне ў нашых беларускіх венах, як ніколі не знікне чырвоная рыса на белым абрусе.

***8***

Чамусьці так брыдка і цяжка ўнутры, ажно не ведаю, што рабіць. Можа, што ідзе шэры й мокры дождж, або таму, што няма ні сонца, ні зорак. У такую хвіліну думаеш: чаму ў цябе няма ўласнай зоркі, якая свеціць тады, калі хочаш менавіта ты. Нават, калі б яна была на акамулятарах, бо яе можна было б зараджаць, і яна б свяціла ярка-ярка, а можа — нават і гарэла б.

Кажуць, калі цяжка на душы, вельмі добра шмат выпіць. Альбо моцна накрычаць на каго-небудзь. А можна — біць талеркі ці кідаць імі ў сваіх хатніх. Некаторым дапамагае дзерці паперу, але ў гэтым мала выгоды. Можна выйсці ў лес і пакрычаць або проста паплакаць. Здаецца, столькі спосабаў, а нічога не дапамагае...

Піць няма чаго, крычаць няма на каго, да лесу вельмі далёка, а плакаць знарок, без прычыны — я не ўмею. Талеркі біла і паперу драла — не верце: не дапамагае, толькі смецця нарабіла.

Уявіце сабе: здаецца, столькі людзей сумных у нашым горадзе, што можна цэлы гурток стварыць, а можа, і вялікае аб’яднанне: «Людзі, якім дрэнна жыць». Бо калі йдзеш па вуліцы, можа, толькі адзін з дзесяткаў твараў выглядае, як твар чалавека, а не якога-небудзь монстра, а каб знайсці шчаслівага, або проста — чалавека, які ўсміхаецца, трэба палову горада абысці. Не, калі ўяўляеш, што і ты зараз выглядаеш гэтак жа, дык яшчэ горш робіцца.

Але — не, я ўпэўненая, што гэта не назаўсёды, і праз некаторы час, можа, усе без выключэння будуць шчаслівыя, кожны па-свойму.

А пакуль — так брыдка і цяжка ўнутры, можна проста парадавацца, што дождж менавіта мокры, а не сухі, і шэры, а не чырвоны, і што нам не трэба плаціць за электраэнергію для зоркі, і што быць чалавекам, тым больш такім выключным і самым лепшым, як вы, гэта — *КЛАСНА!*

# АЛЕСЬ ДЗІТРЫХ



*Мушу быць шчырым нават у такіх праявах ego, калі боязна быць незразуметым. Сапраўдная творчасць — пакута, але пакута салодкая і падманная адначасова.*

*Паэзія — свет ілюзіі, у якой найбольш яскрава высвечваюцца прычыны, што натхняюць цябе на выказванне праўды; праўды, захутанай у пяшчотны вэлюм рамантызму.*



## ПАГЛЯД

Пагляд, самотны твой пагляд…
Так, праўда ў ім.
Што ж, не ідзе жыццё на лад,
а мы — маўчым.
А мы маўчым, бо плыні фраз
не перадаць
пачуццяў тых, што ў кожным з нас
баляць.
І хлусім зноў, што нам не ў знак,
усё адно,
дзе будзе жыцце, з кім, і як,
і што яно.
Усё шукаем, як святло,
зачын прычын,
хаця не родныя даўно.
Таму маўчым.

* * *

Рукі стрэліся нашы, а душы
засталіся глухімі. З ярма,
адчуваю што вырвацца мушу,
ды спрацівіцца моцы няма.

Вуснаў слодыч — і лекі й атрута —
да жыцця ажывяць, каб наноў
невычерпнай, шалёнай пакутай
запаліць мне юнацкую кроў.

* * *

Крыжуюць нябёсы каметы —
у прышласць з нябыту лятуць,
прарочаць няшчасці сусвету,

а я толькі думаю: дзе ты,
кім рукі твае абагрэты
і як мне цябе пачуць?

Ці зоры пагаснуць, ці сонца —
што думаць пра тое цяпер?
Надзея — жывая бясконца.

Надзея — паранены звер —
залізвае горкія раны,
што ёй прычыніў недавер.

Крыжуюць нябёсы каметы —
прарочаць няшчасці сусвету,
а я толькі думаю: дзе ты,
і як мне цябе пачуць.

* * *

Вачэй блакітная смуга —
душы ўтрапенне.
У іх знайшла твая туга
увасабленне.

Найсветлы цяжар юных сноў —
нібыта ўзвівы
трагічных скрыпкі галасоў
і пералівы.

Дарога ясная відна
да існай ролі,
табой абраная яна
з уласнай волі.

Яшчэ ты зведаеш свае
і ўзлёты й спады —
жыццё з чужым жыццём звядзе
твае да ладу.

Насустрач шчасцю руш смялей,
не аглядайся
на шэрань дзён, і надалей
сабой застанься.

Каханне ж першае міне —
не гэта цяжар,
але і ён у сівізне
трывала ляжа.

* * *

На шыбе спацелай здрада
профіль класічны свой
намалявала памадай
стомлена-залатой...
Проста цябе прыгадаў я
сумнай часінай начной...
Сцежкамі цёплага траўня
мы разышліся… Не стой.

* * *

Зноў пабачыў цябе.
Ты змянілася:
больш разважна гаворыш, усмех
напускны. У жыцці абабілася
ды спатоліла прагнасць уцех.

А тады, калі радасна клалася
на мядовы цяжкі мурог,
ты кахала мяне і не кралася
на чужы непрыветны парог.

Ты прыйшла, як заўжды, басаножая,
па расе разышоўся след...

Ды не прыйдзеш ужо, мая гожая,
той, якая змяняла свет...

Надламалася штосьці:
не хочацца
больш на сонца, на зоры глядзець.
Да цябе зноў варочацца —
як у бездань з разгону ўляцець.

## ЦЯЖАР

Божа! Чаму цяжка жыць?
Чаму спарадзіў Ты мяне?
Каханне — як сон прабяжыць,
самота — як Лета плыве.

Нашто мяне ў зманны свет
Ты з ласкі Сваёй пусціў?
Каб быў я нязнаны паэт?
Каб у пакутах пражыў?

Што ж мучыць мяне недавер?
Ці, можа, маю душу
за жыцці *тады* цяпер
Ты ўвабраў у іржу?

Я — грэшны. Да скрайняй мяжы
з Табою мне жыць і застацца.
Што ж, Божа, маўчыш? Адкажы!
Мне цяжка з Табой спрачацца.

## БОЛЬ

Дзякуй Богу, што не з табой
першы раз я спазнаў каханне,
што жыцця залаты сувой
не спляталі з табой да рання.

Не дзялілі агульны хлеб,
не спынялі ўзаемна болю.
Толькі сверб, твой юрлівы сверб
для цябе грае нейкую ролю.

Глянь: навокал — адчай жыцця...
Ці ж маленнем цябе я ўзрушу!
Не маўчы — адкажы, ці ж я
ні пра што ўсё маліцца мушу?

## ВІЦЕБСК

Ліпнёвы дождж між карнавалу
расой нябёснаю абмыў
гарачы водар юных целаў.
Стракаты росплеск тратуараў
стамлёнай змейкаю паплыў
у засень пасвяжэлых сквераў.
Рука спалучана з рукою,
мігценне ў здзіўленых вачах,
як прадчуванне насалоды…
Сярод акацый над ракою
кране каханых па плячах
крыло начное прахалоды.
Каханне ў песні застанецца
нам на дваіх.
Святло разбуджаных вакзалаў,
расстанне — міг.
Тугою ў ноч няхай пральецца
здзічэлы ў мудрасці
Шагалаў штрых.

## ПЕСНЯРУ

Бываюць песні лебядзіныя,
кароткія, як развітальны ўздых,

і хвілі радасці адзіныя,
калі ты ўласны дух спасціг.
Няўлоўна, зманліва і прывідна
лёс завяршае піруэт:
няпраўду-праўду пі да дна,
калі ты ад жыцця паэт!
Не жалься Богу, што зняверавы,
не патрабуй сабе цішы.
А не — жыві свой век, адмераны,
і вершаў болей не пішы.

## ФІЛОСАФУ XXI ВЕКУ

Новы век ідзе. Ззяе далячынь
фарбамі агнёў, зманнасцю прычын.
Кожны новы дзень лашчыць небакрай
шчасцем адкрыцця, што надыдзе рай.

З трапяткой душой — ахапляе жах! —
ты ідзеш далей па чужых касцях
да святых вышынь існасці й быцця,
кінуўшы наўзбоч радасці жыцця.

Пэўне, носіш ты мудрасці ярмо;
хоць і хараство, ды нішто яно:
век ідзе, яго нам не перагнаць —
кожны ў ім адзін будзе паміраць.

## DZINTARS*

*Ахвярую Марыі Скуратовіч*

Залацісты бурштынавы дождж
са смарагдавых хваль наплывае,
абдымае маністамі дзюны —

* Бурштын (латышск.).

мора ў прыступе буры кідае
вечны скарб сваіх нетраў
на пясчаныя руны.

Цьмяных зорак начное святло
ападае з далёкіх сусветаў,
разбіваецца ў хвалях і гіне.
Ды праз тысячы зімаў і летаў
з пракавецця глыбіняў
выплывае бурштынам.

Гэты чысты балтыйскі бурштын
хай сагрэе цябе ў цяжкай хвілі,
шчасціць лёс твой няхай ён дзявочы —
дзесьці там, праз мільярдныя мілі,
аглядалі калісьці яго
закаханыя вочы.

## REQUIEM NAUTII

Прачула грае арганіст
пра сумны лёс ваш і за вас
узносіць люд святло малітвы
да Бога ў велічы ўтрапення:
«Lai tava sirds vairs nebaidas…»** —
гудзе гатычнае скляпенне.

Святы барочны пераліў
злучае неба і зямлю
і дух людскі яднае з Богам.
Плывуць стагоддзі, і маленне,
нібыта зернетка раллю,
узможа вашае збавенне.

Зрушоных хваляў грозны вал
не змог вам душаў — як скала,
вы адстаялі ў грознай бітве;

** Хай тваё сэрца больш не журыцца (латышск.).

а мара ў вечнасць адплыла,
і юнь загінула не ў час.
Lai tava sirds vairs nebaidas…

## ЛІБАВА

Шумны тлум узбярэжнай Лібавы…
Солань мора натоўпу людзей
дух бадзёрыць — лаўцам пераправы
да нязбытных і марных надзей.

За халоднай самотаю мора —
берагі чужаземцаў ляжаць.
Там — збавенне з прадвечнага гора,
у тузе там усім паміраць.

О Лібава! Даўно ўжо, бяздомны,
мільгацеў і вірыўся той тлум
гнаных лёсам ліцвінаў патомных,
царскай ласкай адданых на глум.

Гул натоўпу не сціх за гадамі —
рэхам тоіцца ён між муроў.
І праз ноч вабіць порт маякамі
душы зніклых у мжы туманоў.

Карабель у бязмежнасць адносіць,
праз стагоддзі той груз ён вязе…
Толькі хваля задумна выносіць
па бурштынавай цёплай слязе.

## ДАЦЭ

Ах, якая харошая Дацэ!
Прыгажуні павабны пагляд
зводзіць з тропу юнацкае сэрца…
— Арганіст малады
не галіў барады!..

І — смяецца.
Сакаўная дзяўчына! А водар
спелых вуснаў так хоча адчуць
арганіст малады і прыгожы…
Ён не есць і не п’е.
Ці ж маўчаннем яе
пераможа?
Хлопцу з жалю свет стаўся нялюбы,
не ўзвіваецца нотай арган.
Думка чорнай назолаю б’ецца:
«Не праспі цэлы свет,
бо другому той квет
дастанецца!»
Ды не важыцца хлопец. Рашуча
думку тую адпуджвае прэч:
«Што ж я розуму хіба не маю?!.
Дзе ёй дзецца? Куды?
Я ж яшчэ малады —
пачакаю!..»
Доўга Дацэ ў надзеі чакала,
выглядала і ўдзень, і ўначы…
Старасць неяк няўзнак прыплялася,
але з ёй, як з нудой
непазбыўнай сваёй,
прыжылася.
Ах, якая самотная Дацэ!
Ах, маркотны які арганіст!
І нялюбы ім свет, і нямілы…
І да неба багам
разлівае арган
пералівы…

## РЫГА. БАЛЕТ

*Рыгору Барадуліну*

Знікаюць у ноч сілуэты
танкіх балярын, маладых баляронаў…

А вам векавечыць, паэты,
жарсці нашчадкаў нямецкіх баронаў.

Не ладзіцца арфа ў паэта
і вершык здаецца заўбогі…
На Даўгаве, ля парапета,
пераплятаюцца стройныя ногі.

Не ладзіцца песня для спеву,
і сэрцу няма паратунку —
Адам прычашчае Эву
латышскім сваім пацалункам.

Знікаюць у ноч сілуэты
танкіх балярын, маладых баляронаў…
Не нам апяваць, паэты,
страсных нашчадкаў нямецкіх баронаў…

## НЯЛЮБАЙ ЖАНЧЫНЕ

Мне твой праклён — узнагарода,
раўнівасць — светлая надзея.
Праклён, раўнівасць — гэта мода,
а для цябе яна — падзея.
Не праклінаюць раўнадушна,
як не маўчаць без спадзявання.
Табе здаецца — робіш слушна,
сама ж — згараеш ад кахання.
Клянеш, каб іншая жанчына
сваіх вішнёвых вуснаў спеласць
не аддала мне. Вось прычына!
Тваіх праклёнаў ашалеласць
звядзе далёка. З ёю страсна
свой лёс няшчасцем ты пазначыш,
бо не мяне — праклён уласны
ты ў блізкай прышласці пабачыш.

* * *

Нарэшце адзін... Дазмагаўся.
Былое знікае — як сон,
што моцна табе ўпадабаўся:
расплюшчваеш вочы, а ён
разбіўся па шкельцах акон.

Як дождж, так і сон адмыслова
змывае і плямы, і пыл:
была б толькі шчырасць асновай —
і дужасці хопіць, і сіл,
і высілкаў змучаных жыл.

Ды што сумаваць — я ж не плачу,
а п’ю па заслужанай кварце
за ўдачу, а мо і няўдачу...
Нясуць ручаі па асфальце
былое ў патрушчанай смальце.

* * *

Было так весела мне ўчора,
а сёння — горка...
Світанак выкаціўся з мора,
а ноч вавёркай
шмыгнула ў лес і хвост схавала
спаміж гушчараў.
Вясна вянкі свае звязала.
З нізін-выжараў
выходзіць лета грацыёзна,
плыве па росах,
сцякае сонечна і слёзна
па соснах босых.
А я іду з табою поруч
да павароту —
за ім знікае боль і горыч
жыццевароту.

Датуль дайду і перастану
з табой спрачацца.
Давай без крыўдаў і падману
далей спяшацца.
Было нам весела і ўчора,
і заўтра — будзе!
А сваркі... што ж, такога гора!
Усе мы — людзі.

* * *

Выбачэння папросіш, ды толькі
на каханне не маеш крэдыту.
Ці душой пакаянне адчула?
Сум вярэдзяць сардэчныя болькі,
нібы вецер падраную світу...
Гэтак позіркам разанула,
быццам вырвала сэрца бандыту.

* * *

Зыходзіце ўсе ад мяне — на вякі,
раптоўна, з усмешкаю,
без развітання,
па цёплай расе, ні падаўшы рукі,
ні — словам паспешлівым —
дату спаткання.
Як снег у цяпле трапяткой далані
халоднымі кроплямі
ў смерць уцякае,
так лёс, паабцяўшы ў сядле рамяні,
агнём занямелае
не напаўняе.
Навокал шляхі пранялі далячынь,
за ёй — залацістыя зоркі
ды сонца,
а побач — грахі ды крывавая стынь

адчаю самотнага
ходзяць бясконца.
Не скажаце мне, дзе лунае душа —
вяршыні з нізінамі
пераплывае.
Я сёння — на дне, і глухая ціш•
былога прывідамі
дух пахланае.

* * *

Салігорскі вакзал... Неба з•рань
сыпле золата на прысады.
Я вярнуўся ў юнацкую гавань
адпачыць ад падману, звады.

Зноў знясілены, ашалела
забіраю на поўныя грудзі —
здрада ў памяці спарахнела.
Новы дзень больш ласкавы будзе.

# ТАЦЦЯНА ДУБОЎСКАЯ



*Нарадзілася ў Паставах у 1979 г. Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры па спецыяльнасці тэледраматургія. Зараз вучуся ў Белдзяржуніверсітэце — аспірантка.*

*Лічу, што мацней за ўсё на свеце — каханне. Таму амаль усе мае творы — пра каханне, якое перамагае нават час і прастору.*

Т. Дубоўская

## ДЗЁННІК АДНАГО ЗЛАЧЫНЦЫ

### *Апошні дзень мінулага года*

Дарога зноў цягнецца крывой стужкай… Учора мы сустрэліся, а сёння ты пакінуў мне толькі ўспаміны. Не самыя лепшыя.

А з раніцы ідзе дождж. Можа, і добра, што ён ідзе: хай змывае бруд і пыл са знясіленай зямлі, загойвае раны й трэшчыны.

Я думала, што ўсё будзе інакш. Колькі разоў, нібы кіно, пракручвала гэта ў марах. Але ўсё аказалася працей: ні асалоды, ні шчасця, як пішуць у раманах. Гэта хутчэй падобна да нейкага абрабавання. Уварваўся без запрашэння ў маё жыццё, загаварыў байкамі, а тым часам, як вопытны злодзей, прыкмеціў, што не так ляжыць. Не паспела апрытомнець ад казачнага сну, як ты скраў самую каштоўную рэч і знік у небыццё.

А можа, не было цябе? Можа, гэта толькі мае мары ці глюкі?..

Розум хацеў бы гэтага.

Але цела кожнай сваёй клетачкай крычыць, што не сон усё. Не сон… не сон… СТОГН.

Не крычала. Толькі ціха стагнала, заўважыўшы, што абрабаваная.

Адно не крыўдна — у злодзея прыгожыя вочы, крыху нахабныя. Рабаваў — глядзеў цягучым позіркам. А вусны пякуць слых дагэтуль.

Падманулася: сама дазволіла сябе абрабаваць. Страціла, нават не падарыла — аддала незнаёмцу з цягучым, як мёд, позіркам тое адзінае, што другі раз не набываецца.

### *Дзень дваццаты гэтага года*

Дарога не заканчваецца. Крыху надакучыла ехаць. Каб яшчэ ведала, куды. Дождж больш не ідзе. На вокнах высахлі ўсе кропелькі. Наталіла смагу зямля, загаіла раны й пачала пладаносіць: буйнеюць травы, цвітуць сады…

Трэба радавацца б, але пад сэрцам цяжар. Не тое, каб пакутвала ад страты. Гэта перайшло ў разрад пабочнага. Больш хвалюе, дзе той незнаёмец-злачынца?

Вось, цяпер назвала яго злачынцам, роўна такім, як і я. І будзем судзімыя па адным артыкуле, адной меркай, як тыя, хто не выканаў запаведзь сёмую.

Але гэта будзе там. А хто прыцягне яго да адказнасці тут? Ці, можа, не трэба нічога? Гары яно ўсё гарам. І адказнасці менш…

### *Дзень трыццаты гэтага года*

Учора цягнік спыніўся. Нарэшце вызвалілася ад усяго, што трымала нібы ў цісках.

Бачыла, як выкарчоўваюць дрэвы. На імгненне нават спужалася: што гэта будзе? У дрэваў, напэўна, таксама ёсць душы. Гэта іх галасы чуліся ў трэску, яны нават заглушалі звыклы грукат колаў. А зямля стагнала, ляцелі яе камячыкі ў розныя бакі, нібы пырскала кроў.

Карэнні потым павывозілі. Пуста стала. Голая зямля — страціла яна і цнатлівасць, і дзяцей. Здаецца, і не патрэбная нікому. Але чым жа яна вінаватая?..

Яшчэ адзін грэх на душу ўзваліла. Сама. Па асабістай волі. Так жа лёгка, як і аддала самае каштоўнае, і зноў дазволіла сябе абрабаваць. На гэты раз больш жорстка і бязлітасна.

А можа, гэта сон, і не было нічога?

Душа б так хацела.

Але боль не дае забыцца: не сон… не сон… не стогн — КРЫК.

Крычала, але не супраціўлялася. Нават не заўважыла, як абрабавалі — усё злілося ў суцэльны нудны плач.

У вочы злодзею не глядзела — не было ў яго вачэй.

Усё — я вольная. Вольная ад абавязкаў.

### *Дзень саракавы гэтага года*

Шкада, што не трэба больш нікуды ехаць. Мне не падабаецца тут. Кожную ноч прыходзяць цені выкарчаваных дрэваў. Плачуць, стогнуць... І я прачынаюся ад унутранай пустэчы. Ніколі не адчувала яе так матэрыяльна.

Саджуся за стол, бяру аловак, але пісаць не магу. Брыдка і мярзотна.

Вы адчувалі сябе забойцам? Я дагэтуль — не. Цяпер — кожную хвіліну. Забіваю час, памяць, забіваю сумленне.

А дрэвы прыходзяць кожную ноч…

### *Дзень сто васьмідзесяты гэтага года*

Сустрэла ўчора незнаёмца з цягучым позіркам. Зрабілі выгляд, што не пазналі адзін аднаго. Павінна была б злавацца ці ненавідзець, але нічога не адчуваю. Тое, што ён пакінуў узамен, таксама ўкралі. А ўспаміны? Зраўнаваліся, як тая зямля, з якой выкарчавалі дрэвы.

Яшчэ ныя рана. Напэўна, усё астатняе жыццё так будзе. Nit inultum remanebit.* У поўнай меры гэтага не адчула, але ведаю, што прыйдзе час. І тады не схаваешся, не ўцячэш, нават цягнік не дапаможа.

Цікава, як адчуваюць сябе злачынцы-саўдзельнікі? Спяць спакойна? Ва ўсякім разе, пустэча іх не турбуе — пустыя яны заўсёды. А шкада…

На тым месцы, дзе выкарчавалі дрэвы, будуюць дзіцячы дом — сірочы прытулак. Некалі асуджала маці, якая можа аддаць сваё дзіця, нібы непатрэбную рэч. А ці маю на гэтае права цяпер?

### *Дзень дзвесце сорак пяты гэтага года*

Усю ноч не магла заснуць: боль рэзкая, невыносная. Заплюшчваю вочы — пачынае глючыць. Толькі пад раніцу сцішылася. А з вачэй — слёзы. І не хачу плакаць — самі ліюцца.

Сёння магло б пачацца новае жыццё. Ды не пажадала, не захацела, сама ў сябе скрала.

### *Дзень трыццаты наступнага года*

Зноў сарвалася з месца. Еду, але цяпер ведаю, куды. На гэты раз вырашаю не адна, што рабіць і як.

За акном пралятаюць палі, гарады. Як і ў мінулым годзе, зямля патрабуе вільгаці: ссохлася ад няшчаднага сонца. Але дождж чамусьці не спяшаецца падарыць ажыўляльны напой, нібы чакае чагосьці.

Мне крыху боязна, а раптам — што будзе не так? Я павінна была расказаць усё раней. Але не магла, дый позна ўжо. Мінулае — ёсць мінулае. Яно не павінна замінаць…

---

*Нішто не застаецца не адпомшчаным (лац.).

### *Дзень пяцідзесяты наступнага года*

Вясна ў гэтым годзе была позняя. Здаецца, і дождж ішоў, і сонца ставала, але раслiннасць нейкая хілая. А на днях сустрэла дрэва, якое так і не распусцілася. Напэўна, змерзла ўзімку: адно яно сярод поля. Так і стаіць — сухое і адзінокае.

А мне зноў пачалі сніцца выкарчаваныя дрэвы. Крычу і плачу ў сне. ЁН таксама прачынаецца, абдымае мяне і пачынае суцяшаць. Пустэча адпускае — засынаю, як дзіця, і ўжо сплю да раніцы.

Заўтра трэба схадзіць на кансультацыю...

### *Дзень двухсоты наступнага года*

Нічога не дапамагае. Кажуць, што вінавата сама. Я ж ведаю. Але як растлумачыць гэта яму? ЁН нешта адчувае, але не падае выгляду, супакойвае і спрабуе адцягнуць маю ўвагу на іншае. А я ж бачу, што яму таксама баліць.

Учора прынёс маленькае кацяня, такое пухнатае, беленькае, з вялікімі гузікамі-вочкамі.

А сёння — ледзь не звярнуў шыю, назіраючы за шчаслівым бацькам, які бавіўся з немаўляці.

Вось і адчула ў поўнай меры Nit inultum remanebit.

### *Дзень апошні наступнага года*

З раніцы падае снег, мяккі, бы пух, і такі халодны…

Кацяня ўжо ладна падрасло і гуляе з маім алоўкам, а яшчэ ловіць на акне сняжынкі: б’е лапкай па шкле, і не можа зразумець, што гэта за перашкода.

У суседзяў нарадзілася дзіця. Плача цэлы дзень і ноч. Я так больш не магу. Можа, пераехаць?.. Ужо дзесьці з тыдзень дрэнна сябе адчуваю. ЁН угаворвае пайсці ў бальніцу: а раптам?.. Толькі мне з цяжкасцю ў гэта верыцца.

Дрэвы больш у сне не з’яўляюцца — сплю спакойна і моцна. Можа, дараванне атрымала?

Дапамажы, Божа, на цябе толькі спадзяюся.

Et fiat voluntas tua…**

---

** І хай будзе воля твая (лац.)

## ПІСЬМО

### *(Фрагмент)*

Пісьмо ў нікуды… Калі б звышнатуральныя сілы змаглі закруціць, загарнуць яго і, рассякаючы прастору, данесці адрасату…

Колькі пяшчоты й цеплыні, затоенага суму ў гэтых радках. Стагоддзі між гэтым лістом і тым, для каго ён напісаны. Але, калі існуе каханне, то яно бессмяротнае і непадуладнае часу. І калі-небудзь пісьмо дойдзе да адрасата. Хай гэта будзе яшчэ праз два стагоддзі, але...

Шумела моцная навальніца. Вогненныя стрэлы рассякалі начное неба. Дождж, быццам срабрыстая сетка, злучаў яго з зямлёй, што ператварылася ў суцэльную раку, якая зносіць на сваім шляху ўсё, што трапляецца.

Аляксандр сядзеў у бібліятэцы. Падняўся з крэсла і падышоў да акна. «Вось ужо тры гады, як іншаземка паехала. Дзе яна цяпер? Тры доўгія цяжкія гады ад яе няма ні адной вестачкі...» Калі яна знікла, зямля апусцела. Пацямнела святло. Гэтыя пустыя жанчыны на балах, свецкія размовы, мужчынскія кампаніі — усё цяпер здавалася нудным і бязглуздым. Ці ж можна яе кім-небудзь замяніць? А тым больш, яго нарачонай? Ды гэта ж — зямля і неба! Як можна быць такой дурной і страшэнна худой, быццам шкілет! Ці ж такая жонка яму патрэбна? Аляксандр знарок адцягваў дату жаніцьбы. Але не можа гэта прадаўжацца бясконца. Грамадства патрабуе. І ён мусіць падпарадкавацца...

Нават праз тры гады ён выразна ўяўляў Грэтхен: яе зеленаватыя вялізныя вочы, светлыя мяккія валасы, статную постаць, скуру, што аксаміт… Правёў рукой па ўяўнай фігуры. «Якая гладкая і цёплая... — рука апускалася ўсё ніжэй, але тут жа нібы ачуняў ад сну. — Не, дакуль гэта будзе цягнуцца? Я звар’яцею. Я, напэўна, ужо з глузду з’ехаў. Грэтхен, што ты са мной робіш? Што Вы робіце са мной, іншаземка?!.»

Аляксандр у адчаі сціснуў галаву рукамі. Здавалася, яшчэ імгненне — і ён не зможа стрымліваць слёзаў. Але ўзяў сябе ў рукі. «Я знайду яе! — прамільгнула шалёная думка. — А чаму б і не? Хоць тое, што я пра яе ведаю, не магло б дапамагчы ў пошуках нават тут, не кажучы пра іншыя дзяржавы. Адкуль яна? Імя? Часам яно гаворыць пра многае, але…»

Надзея, што мільганула ў блакітных вачах, зноў патухла. І ўсё ж, Аляксандр быў моцнай натурай і зноў знайшоў ў сабе сілы паверыць у магчымасць задуманага. Ён рашуча ўзяў пяро і, абмакнуўшы яго ў чарнілы, напісаў размашыстым почыркам: «Я знайду цябе, Грэтхен, чаго б мне гэта не каштавала!..»

Граф хацеў ужо выйсці з бібліятэкі, як у дзверы ціха пастукалі. На парозе стаяў камергер.

— Прашу прабачэння, пан Аляксандр, вам пісьмо.

— Ад каго? — абыякава ўзяў канверт, бо ўжо не чакаў вестак ад Грэтхэн.

Дварэцкі ў адказ спагадліва паціснуў плячыма, ведаючы, чыё пісьмо чакае яго гаспадар.

Не гледзячы на канверт, граф паклаў пісьмо ў кішэню і вырашыў падняцца да сябе ў пакой, але не паспеў. У дом увайшоў селянін. Ручайкі вады сцякалі з яго на паркетную падлогу.

— Што здарылася, Касьян? — як добры гаспадар, граф ведаў амаль ўсіх сваіх прыгонных па імёнах.

— Там… плаціну прарвала…

Не стаў даслухваць — трэба тэрмінова дзейнічаць... Ён аддаваў дакладныя загады і ўказанні, ні на імгненне не губляючы ўпэўненасці й спакою; асабіста ўдзельнічаў у аднаўленні пашкоджання, разам з сялянамі цягаў бярвенні, ставіў сваі й забіваў іх...

Навальніца, на шчасце, скончылася. І таму дастаткова хутка плаціна была адноўленая. Аляксандр, калі прыйшоў дамоў, адчуў такую страшэнную стомленасць, што, не распранаючыся, лёг спаць і недзе праз пяць хвілін спаў так моцна, што яго не змагла б разбудзіць нават гармата. А пісьмо спакойна ляжала ў кішэні й саграваала сэрца.

Наступная раніца падарыла наваколлю цёплае, надзвычай яснае надвор’е. Наколькі ўвечары бушавала навальніца, настолькі ранішняе сонца залівала сваімі промнямі лугі, палеткі, пранікала ў кожную шчыліну саду і маёнтка. Аляксандр прачнуўся ад таго, што сонечны зайчык скакаў па яго твары. Спрабуючы адмахнуцца ад назойлівага праменьчыка, ён урэшце падняўся. Паясніца і рукі вельмі нылі — адразу ж прыгадаў учарашнюю цяжкую працу. Каб не хваравітыя адчуванні, можна было б падумаць, што ўсё саснілася.

Ён закончыў ранішні туалет і спусціўся ў бібліятэку. Трэба было прыняць упраўляючых, вырашыць нарэшце пытанне, звязанае

з продажам лесу, а па-другое — пытанне больш важнае, як лічыў ён сам — пачаць пошукі Грэтхен: паехаць ў ведамства па замежных справах. З чагосьці ж трэба пачынаць, там у яго знаёмыя — можна разлічваць на поспех.

Размова з упраўляючымі заняла даволі шмат часу, але была нялішняй. Усе фінансавыя пытанні яны вырашылі, і, будучы ў добрым настроі, граф загадаў запрэгчы коней.

Нарэшце Маргарыта дабралася да цікавых для яе дакументаў. Сэрца моцна застукала, калі ўзяла папку ў рукі. Што хацела знайсці ў гэтых старых паперах, які доказ, пакуль не ведала. Больш чым год прайшоў з таго часу, а памяць яшчэ трымае ўсе падзеі на каляровай стужцы. Ды, можа, нават і некалькі стагоддзяў мінула. Маргарыта сама заблыталася. Ці было яе падарожжа сапраўднасцю? Можа, усё толькі трызненне ці сон? Гэтыя пытанні ніяк не давалі спакою, але яна, можна сказаць, вызначылася з тэмай сваёй доктарскай дысертацыі. Толькі б хапіла архіўных матэрыялаў, бо не скажаш жа, што ты сам усё бачыў.

Маргарыта праглядала старыя пісьмы. Адно з іх прымусіла сэрца яе забіцца мацней. Гэтага не можа быць — яна бачыла ліст не ў першы раз!.. Узяла свае запісы й прыклала да ліста — почырк супадаў да драбнейшай рысачкі. У подпісу не было нічога незвычайнага, толькі дата была размыта: ці ад часу, ці пастаралася вада...

## КАРЦІНА

### *РАДЫЁП'ЕСА*

**ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:**

*КЕН* — калекцыянер антыкварыяту.
*ТЭЯ* — яго жонка.
*ХЛОЯ* — яе сяброўка, закаханая ў Кена.
*ГЕРА* — былая сяброўка Кена, яна ж — падатковы інспектар.
*ГОЛАС* — прахожы на вуліцы.

## *ДЗЕЯ-1*

*(Музычная афарбоўка — званочкі)*

*Кен.* Нарэшце, мая мара здзейсніцца!

*Тэя.* Так, Кен, ты выкрыкваеш штораз, калі набываеш якое-небудзь барахло.

*Кен.* Што ты, Тэя, мы ж дамовіліся. *(Рэзка)* І не будзем абмяркоўваць мае захапленні!

*Тэя.* Што на гэты раз?

*Кен.* (У захапленні). Карціна! Я шукаў яе ўсё жыццё…

*Тэя.* Не, гэта не выносна! Дакуль мне цярпець тваю знявагу і халоднасць?

*Кен.* Ты ведала, за каго выходзіла замуж.

*Тэя.* Але б ты мог прыкінуцца, што кахаеш…

*Кен.* Не магу я прыкідвацца.

*Тэя.* Навошта ж ты ажаніўся?

*(Званок тэлефона, тупат ног... Кен здымае трубку.)*

*Кен.* Алё… Так, гэта я… Канешне, праз пятнаццаць хвілін… Добра, разлічымся, як і дамаўляліся… Да сустрэчы.

*Тэя.* Колькі на гэты раз?

*Кен.* Чаго?

*Тэя.* Колькі каштуе твая антыкварная рэч?

*Кен.* Гэта не проста антыкварная рэч, гэта — твор мастацтва... Ён бясцэнны. Пажадай мне поспеху, Тэя.

*Тэя.* Жадаю, Кен.

*(Крокі, стук дзвярэй. Тэя адна.)*

*Тэя.* Ненавіджу! Яго і гэтае барахло! *(Перадражнівае.)* Пажадай мне поспеху, Тэя. Каб яно спрахла ўсё, згарэла! Столькі грошай... Я магла б у раскошы купацца, а замест усяго гэтага — непатрэбныя забаўкі, што на сметніку даўно павінны валяцца. Узяць, да прыкладу, гэтую рухлядзь — гадзіннік... Ламачча. Адна толькі каштоўнасць, што пазалочанае акаймаванне ды ходзікі, здаецца, з каштоўнымі каменьчыкамі. Лепш бы ў мяне на пярсцёнку яны былі. А гэты камод… Чырвонае дрэва! Каб ім хоць карыстацца можна было, а то: не чапай, не кранай нават пальцам. Толькі сам ходзіць ды пыл здзімае. Дальбог, ненармальны!.. Можа, палюбоўніка завесці?

*(Званок у дзверы. Тэя бяжыць да іх і адчыняе.)*

## ДЗЕЯ-2

*Тэя.* А, Хлоя, праходзь. Рада цябе бачыць.

*Хлоя.* Я таксама, мая дарагая сяброўка. Як справы? Штосьці ты не ў настроі.

*Тэя.* Што, так відаць?

*Хлоя.* Ды не, акрамя сініх плямаў пад вачыма і злоснага выразу твару, нічога дрэннага.

*Тэя.* Вось бачыш, што робіць з людзьмі вашае хвалёнае мастацтва... А ты, як заўсёды, у форме. У цябе зноў новая сукенка!

*Хлоя.* Не толькі. Вось бранзалет і кальe з дыяментаў. *(Абыякава.)* Падарунак мужа.

*Тэя.* Шчаслівая! А я не помню, калі мне апошні раз што-небудзь дарылі. Кен звар'яцеў са сваім антыкварыятам.

*Хлоя.* Дарэчы, дзе ён?

*Тэя (са злосцю).* Паехаў за новай рухляддзю.

*Хлоя.* Не, ты проста ненармальная! Гэта ж такі агромністы пласт гісторыі ў вашай кватэры…

*Тэя.* Агромністы пласт грошай.

*Хлоя.* Ты не разумееш, такія рэчы бясцэнныя. Што збіраецца набыць Кен на гэты раз?

*Тэя.* Не ведаю... Нейкую карціну. Хлоя, табе гэта цікава?

*Хлоя.* Ты азірніся, тут ёсць такія рэчы, якімі цяпер нават не ведаюць, як карыстацца. Ці, напрыкдад, бярэш гэтае пяро, абмакваеш яго ў чарнілы і ўяўляеш… О, колькі ўсяго можна ўявіць! А можа, гэтым пяром пісаў Пушкін, ці Мальер, ці…

*Тэя.* А на гэтым крэсле сядзеў сам Напалеон Банапарт...

*Хлоя.* А чаму і не?

*Тэя.* І што мне з таго, калі няма цеплыні й кахання, калі муж нават не звяртае на мяне ўвагі з-за сваіх архаічных рэчаў. Вось табе пашанцавала, муж цябе кахае.

*Хлоя (як быццам сабе).* Кахае, як жа!.. Давай памяняемся!

*Тэя.* Як памяняемся?..

*Хлоя.* Звычайна... Хоць і зараз... Шляхам медытацыі мы памяняемся целам.

*Тэя.* А калі мне не спадабаецца?

*Хлоя.* Хто не рызыкуе, той не п’е шампанскага. Ну дык што?.. Можаш падумаць да заўтра, узважыць усе «за» і «супраць». А мне ўжо трэба ісці, да заўтра.

*(Пацалункі, крокі Хлоі на абцасах, стук дзвярэй.)*

*Тэя.* А гэта цівава, можна паспрабаваць.

## ДЗЕЯ-3

*(Шум вуліцы. Кен у роздуме. Музыка.)*

*Кен.* Гэта будзе нешта неверагоднае. Пры дапамозе карціны я змагу зведаць такія таямніцы, у якія нікому яшчэ не даводзілася патрапіць. Толькі разгадаць шыфр да гэтага чытання…

*(Звон шкла — і зноў шум вуліцы, стукаюць дзверы машыны.)*

*Голас.* Гэй, ты асцярожней!.. Ты заснуў?

*Кен.* Прабачце, вось грошы, уставіце новую фару.

*Голас.* Вар’ят.

*(Шум вуліцы сціхае. Музыка, крокі па лесвіцы, званок. Адчыняюцца дзверы, нібы ў ліфце.)*

*Гера.* Праходзь, Кен, вітаю цябе ў сваім палацы.

*Кен.* З кім я размаўляю, можа, пакажацеся?

*(Шум зачыняемых дзвярэй.)*

*Гера.* Сядай, што будзеш піць?

*Кен.* Я не п’ю, хіба толькі содавую. Можа, вы ўсё ж пакажацеся? А то нейк нязвыкла весці гандаль з голасам.

*Гера.* Я думала, мы дамовіліся на конт аплаты.

*Кен.* Так. Мне проста было б зручней, каб бачыць вас.

*Гера.* Кен, бачыш насупраць рамку?

*Кен.* Пустое палатно?

*Гера.* Чаму пустое? Прыгдедзься, углыбіні — дзверы. Адчыні іх.

*Кен.* І сапраўды дзверы! Як я адразу іх не заўважыў?

*Гера.*Так, адчыняй іх.

*Кен.* Вы здзекуецеся, як можна адчыніць дзверы на карціне?

*Гера.* Кен, а ты паспрабуй зрабіць немагчымае. Скіруй усе свае думкі, і ўсё стане падуладным.

*Кен.* Пачакайце, я некалі ўжо чуў гэтыя словы. Толькі дзе?

*Гера.* Не адцягвай увагу, Кен, адчыняй дзверы.

*Кен.* Гэта цяжка…

*(Музыка, якая выяўляе напружанне.)*

*Кен.* Атрымалася! Я адчыніў іх! А цяпер?..

*Гера.* А цяпер можаш зайсці.

*Кен.* О, дык гэта тая карціна! Неверагодна.

*(Павольная музыка.)*

*Гера.* Прывітанне, Кен.

*Кен.* Ге-ра?..

*Гера.* Не чакаў убачыць мяне?

*Кен.* А ты зусім не змянілася. Тыя ж доўгія шаўковыя валасы, рымскі нос, пякучыя вусны й ніводнай зморшчынкі на твары… Быццам і не было дваццаці гадоў. І гэта тая самая кватэра, мой любімы стол, канапа, тыя ж зялёныя фіранкі… Усё, як тады, у тую апошнюю сустрэчу.

*Гера.* Там, на стале, дакументы па перадачы карціны. Усё законна. Засталося паставіць твой подпіс. Ты ж згодны на ўсе перагавораныя ўмовы?

*Кен.* Згодны. Толькі мне патрэбны шыфр.

*Гера.* Ты мне сам яго адкрыў дваццаць гадоў таму, калі сказаў, як забыць усё, што было між намі.

*Кен.* У цябе атрымалася?

*Гера.* Гэта не важна. У цябе атрымалася: ты адчыніў дзверы.

*Кен.* З тваёй дапамогай…

*Гера.* У наступны раз яна не спатрэбіцца. Ты сам ведаеш шыфр.

*Кен.* Дзе падпісацца?

*(Чуюцца крокі, нібы стукае сэрца.)*

*Гера.* Вось тут, унізе.

*Кен.* Гера…

*(Маўчанне.)*

*Кен.* Чаму ў цябе рукі халодныя?

*Гера.* Падпісвай, Кен.

*(Рыпіць пяро.)*

*Кен.* Антыкварнае?

*Гера.* XVI стагоддзе. *(Шэлест паперы.)* Яшчэ адзін подпіс. Гэта для мяне — другі экзэмпляр.

*(Рыпіць пяро.)*

*Гера.* Усё, карціна — твая.

*Кен.* Дзякуй, Гера. Я абавязаны табе да свайго скону. Бывай.

*Гера.* Пачакай!.. А пацалунак?

*Кен.* Прабач, зусім забыўся... Я нібы п'яны.

*(Пацалунак, стук сэрца, спачатку — аднаго, потым — двух , і зноў — аднаго.)*

*Гера.* Дзякуй, Кен, ты вызваліў мяне нарэшце.

*(Музыка.)*

## *ДЗЕЯ-4*

*Тэя.* Гэта твой славуты твор мастацтва?

*Кен.* Так.

З чужакамі — чужы,
веры ім не даваў...
І на смерці мяжы
да жыцця заклікаў.

# АКСАНА СПРЫНЧАН



*Іду шляхам жыцця, каб прайсці праз вернасць. Люблю бываць у Чорным замку Альшанскім, на бабровых тонях, у краіне райскай птушкі, у горадзе-утопіі. Каб чытаць зоры й казкі жыцця, вывучыла азбуку любві. Бясконца гатовая слухаць дудку беларускую, жалейку, скрыпку беларускую. Хацела б, каб людзі не журыліся, каб ведалі... Мару пабудаваць гняздо для птушкі радасці. Люблю той стан душы, які магчыма выразіць толькі як безназоўнае. На Купалле пляту вянок з курганнай кветкі й пускаю ў Ясельду. Слухаю крокі па старых лесвіцах, крокі сэрца. Адзначаю свята пчалы, свята ў будзень. Ведаю — ёсць на свеце мой алень. Гэта пра мяне — сена на асфальце, дзень вечаровы, нагбом, назаўжды, трывожнае шчасце, незалежнасць.*

*З усіх земляў мая — новая зямля, мае людзі — людзі на балоце. Нарадзілася і застануся — тут.*



* * *

Рагнеда за сотні гадоў таму
пачуе Слова ад Аксаны
і не захоча рабыніча разуці.
Гарыцвет будзе заўсёды квітнець
успамінам пра волю
для Гарыславы.
Анастасія замоліць грахі мае,
з болем зірне
вачыма мамы...

* * *

А нехта ж жыў
у залатым стагоддзі
для мовы нашае…
А мы з табой
ці за свае правіны,
ці за чужыя
папалі ў іншыя.
А мы з табой
ужо прайшлі
паміж стагоддзяў,
і трэцяга не дадзена.
І ўсё, што скажам мы
на роднай мове,
пакінем гэтым.
А нехта ж дойдзе
па дарозе са словаў нашых
(калі, канешне, яна не будзе
занадта вузкай)
у золата стагоддзяў.

* * *

Натуршчыца —
парабчанка і муза,

скутая мастацтва путамі,
узвышаная яго свабодаю.

* * *

*Паўлу Навуменку,*
*Міхасю Тычыну,*
*Таццяне Шамякінай*

Усе выкладчыкі выкладаюць,
геніяльныя — выкладваюцца.
Менавіта ў іх ты вучышся
не толькі пэўную колькасць гадзін,
адведзеную праграмай,
але і ўсё жыццё.
У геніяльных выкладчыкаў
няма веры ў сваю геніяльнасць —
яны вераць у сваіх вучняў.
Геніяльных выкладчыкаў
заўсёды мала —
вельмі цяжка на свеце гэтым
быць самаадданым.

## ДА СВЯТЛА

*А. Яскевічу*

Ты прынёс Купалу
чырвоную ружу.
Не на магілу,
не да помніка —
паклаў ля яго акна.
«Зваў з путаў на свабоду,
зваў з цемры да святла» —
чуе ружа голас Купалы.
«На свабоду» —
кожным шыпом.

«Да святла» —
кожным пялёсткам.
Твая чырвоная ружа
ля акна Купалы —
да святла.

* * *

Днём вуліц крыжы
перасякаюць мяне.
Ноччу раскрыжоўваю
адзіную вясковую вуліцу.
На згорбленай хаце
па складах чытаю назву —
«Дзя-цін-ства».

* * *

Дзве коскі запляла
і ўспомніла дзяцінства,
дзе я з кароткай стрыжкай
смяюся з фотаздымкаў.

* * *

Чорным квадратам Малевіча
гарыць дзевяць цёмных вокнаў
сярод цьмянага святла астатніх.
А хто там жыве?

## ЗЯЗЮЛЯ ЛЫСАЙ ГАРЫ

*Ведзьмаку Лысагорскаму*

Стагоддзі дорыць зязюля
на Лысай гары.

Напэўна, ведае,
што ў гарах
доўга жывуць.
А можа, яна адзіная,
хто шкадуе паэтаў
і не шкадуе гадоў для іх
вершаў.

* * *

Чаму ўсе кажуць,
што ў мяне няма слыху?
Я ж чую, як дзівосна
спяваюць жабы.
Ну не мне ж
не хапае слыху
пачуць прыгажосць?!.

* * *

Шукаю тое,
што яшчэ згублю.
І нехта мне
ўвесь час дапамагае...
губляць.

* * *

Вецер шалее ў маіх валасах,
і я ўжо не-я, а Мядуза Гаргона.
Людзі не глядзяць на мяне,
разбягаюцца па хатах
(відаць, што чыталі
міфы Старажытнай Грэцыі).
Ніхто не хоча ўбачыць
нараджэнне Пегаса —
адсекчы мне галаву.

Можа, вось гэты?..
Ды не...
Адным валуном
стала болей
на Беларусі...

* * *

Вецер разносіць
крокі мае,
цяжкія,
нібы цішыня…
Нехта пачуе іх, калі
вернуцца стагоддзі
з вайны.

## 33-ЦІ ТРАЛЕЙБУС

На замерзлым шкле
пакінула сваю далонь.
Хлопчык маленькі сказаў:
«Мама, я таксама хачу
зрабіць так,
каб было ўсё відаць».
І пачуў у адказ:
«Ты ж у мяне разумны...
А гэтая цёця
абавязкова захварэе».

* * *

І ворагу не пажадаю:
ашукацца ў пошуках сябе,
дачакаццца чакання смерці,
атрымаць неўміручасць.

* * *

Успрымаць жыццё па-філасофску —
адзіная магчымасць яго ўспрымаць,
прымаць не зусім прамым,
зусім не прамым
(з усім...).

* * *

Ты заходзіш
праз расчыненае акно
адзінотаю блюза.
Каб не згубіць цябе,
спрабую зачыніць
празрыста-халоднае выйсце
на апошнім паверсе.
Аскепкі шкла разлятаюцца
драпежнымі птушкамі
ў шэраасфальтавы свет.
Праз аголенае акно
сплываюць і ты, і блюз,
і толькі адзінота
з-за сваёй сарамлівасці
не можа пакінуць мяне.

## У ПАРКУ, СТОМЛЕНЫМ ЗІМОЙ...

*

У парку,
стомленым зімой,
перабіраць сухое лісце
пад промнем сонца красавіцкага,
у промнях шчырасці тваёй...
Глядзець у розныя бакі

і бачыць, як Яно мільгае
вавёркай рыжаю...
Яно... Як у Купалы, —
Безназоўнае.

*

У парку,
стомленым зімой,
дзе не куе гады зязюля,
выстуквае раман нам дзяцел,
чырвона-чорны.
Яго падслухвае
Стэндаль.
Страсць абуджаецца
ў прыродзе...

У парку,
стомленым зімой,
гуляе
красавіцкі сон.

* * *

Каханне ў глыбінях сяброўства —
як жамчужына
ў глыбінях
ракавіны,
мора,
чыёйсьці мары.

* * *

Шэрай зязюляй
накуваю табе гадоў.
Жаўруком заспяваю —
убачыш неба.

Ластаўкай буду лятаць над зямлёй —
папярэджваць няшчасці.
Мудрай савою
пакажу празрыстыя дні начэй.
Чырвонай грудкай гіля
на снезе белым
нагадаю пра мінулае
і будучыню Радзімы.
Белым буслом і чорным
падзялю жыццё на палосы.

Толькі птушкаю шчасця
стаць для цябе
не змагу.

* * *

Матуля,
прытулі мяне да сэрца.
Матуля,
наталі мяне пяшчотай.
З табой заўсёды побач
німб ахоўны
ад нелюбові.
А любові ў табе —
Сусвет бязмежны.

Межаў не існуе
і для маёй удзячнасці табе.
Матуля,
прытулі мяне да сэрца.
Матуля,
ты — прытулак для душы.

* * *

Хачу,
каб на маім пахаванні

грала
твая гітара
і мая душа
лётала
разам
з тваім голасам...

Ты не можаш
памерці раней,
бо не ўмею
спяваць.

Не хвалюйся —
чакаць
і там
не развучуся.

* * *

Калі я ападу ў знямозе
на шэры снег тваёй тугі,
не пераблытай:
не сняжынка —
бежанка крывавай бітвы,
адкуль вядзе свае гады
мой горад
вечна малады,
бо вечна ён пасляваенны...
Так, ты — не вой,
і, зразумела,
не пераносіш чырвань снегу.
Заплюшчы вочы...
Я растану,
як толькі памяць адпачне
на берагах тае Нямігі,
дзе кроў ніхто шчэ не ліе.

* * *

*Дзеду і бацьку*

Упасці з неба
ў іншыя нябёсы
так проста,
калі глядзіць
паэт паэту ў вочы.

Упасці з неба
ў іншыя нябёсы
так проста,
калі ты пад аховай
нябёсаў роду.

# НАДЗЕЯ СТАРАВОЙТАВА



*Нарадзілася ў 1976 г. у Мінску. У 1998 г. скончыла філфак БДУ; у 2002 — аспірантуру Інстытута літаратуры НАНБ; выкладаю беларускую мову ў БДЭУ.*

*Друкавала прозу і паэзію ў «Першацвеце» і «Маладосці».*

*Магу падпісацца пад філаманцкім дэвізам: «Не возьмем мы хцівасць ва ўжытак — Прэч сквапнасці, пыхі насенне! Наш самы высокі набытак: Айчына, навука, сумленне!»*

# КАЛЯДНАЕ ПРАРОЦТВА

*Прысвячаецца Франуку Грышкевічу,*
*выдатнаму педагогу і літаратару.*

— Добра, я асцярожненька! — дзяўчына саскочыла з ганка і панеслася ў бок лазні.

Там ужо чакаюць сяброўкі. Бегла скрозь заснежанае поле, не зважаючы на скуготлівы сівер ды калючыя сняжынкі. Гарэзлівая весялосць, амаль дзіцячая дураслівасць, таямнічае прадчуванне чагосьці чароўнага, нязвыклага, адмысловага кружлялі кволую ды цнатлівую душу ў бясконца шчаслівым танку, у сусветным карагодзе суладдзя і гармоніі. Невыславёная музычная бясконцасць прадчування шчасця!

Раптам пачула сабачы брэх — яна прыпынілася: рэха далятала з мястэчка, што за сажалкай. Там жыве Пранціш, паэт з Вільні, які завітаў на Коляды да сваякоў. Яна чула, што быў ён дужа разумны. А як іначай — доктар філасофіі! Вучыўся ў Празе, як некалі й Скарына, ды імя меў такое ж! Адно толькі гэта запалоніла дзяўчыну і яна ўжо лічыла, што кахае гэтага высакароднага і сціплага чалавека, хоць размаўляла з ім усяго толькі раз…

«Мо нават ягоны сабака зараз брэша?..» Гэта радасная вестка. Дзяўчына сцішыла крок, міжволі звярнуўшы ўвагу на яркі месяц, на бліскучы снег, што пераліваўся ў срэбным ззянні. Але тут, гэтаксама раптоўна, сабака завыў так страшэнна, выцінаючы калядную бездань да нябёсаў, што дзяўчына насампраўдзе адчула, як чорнай пачварнай сцяной абступіў яе якісьці далёкі й нерэальны гай, здушыў у бажавольных абдымках. Амаль над галавой па-зладзейску праляцела бясшумная сава. Ад страху, больш не бачачы й не чуючы анічога, зноў пабегла, спатыкаючыся на ледзякі ды гурбачкі, што быццам здраднікі ўсцілалі поле. Сэрцайка трымцела, нібы той сумны агеньчык у вакне лазні, дзе сабраліся на калядную варажбу дзяўчаты.

— Ядвіська, дзе ты ходзіш? — у адзін голас накінуліся сяброўкі. У нас ужо цёпла ў лазні, лучыны гараць, люстэркі стаяць — цябе толькі чакаем!.. Але ж… што гэта з табой, Ядзечка? — зазіраючы ў яе бляклы перапужаны твар, пыталіся таварышкі.

— Нічога, нічога!.. Выццё сабачае пачула, дык і ніякавата неяк зрабілася. А забавілася — вы ж ведаеце, як мая бабця варажбы баіцца, не хацела пускаць!.. Не сярдуйце!.. Дык пачынайма? Вось толькі гэты сабака… збянтэжыў, сэрца штось цісне.

Сямёра дзяўчат паселі кружма, адна пры адной. Варажылі па-рознаму: кідалі на падлогу зерне, пускалі на яго пеўніка, падлічвалі зярняты, выцягвалі з зерня пярсцёнкі; варажылі на бабах ды шальбабоне*, саломе; лілі воск у ваду… Нарэшце, варажылі з люстэркамі. Для гараджанак, якія прыехалі ў даваеннае мястэчка на вакацыі — усё было экзотыкай. Гіленка, Хіма, Адарка ды Ганка бачылі сваіх нарачоных. Адарка свайго пазнала: гэта быў Аўген, тутэйшы, прыгожы чарнявы хлопец. Алеся не дачакалася, калі ў люстэрку з’явіцца твар, з крыкам выскачыла з лазні, чым смяротна перапужала сябровак. А Юльця ўбачыла такога старога псюка, што плачмя плакала яшчэ доўга. Яе супакойвалі — як маглі.

Апошняй варожыць Ядвіся. Ціха дагараюць лучыны, за сценамі скуголіць вецер. Робіцца жудасна. Што пакажа ёй зараз люстэрка: старога і непрыгожага, як Юльці, ці якога знаёмага хлопца, як — Адарцы?

Ядвіся прыгадала бабульчын аповед — як тая варажыла. Яе нарачоны быў такі прыгожы, што заглядзелася на яго: ён і парэзаў ёй шчаку! Знак захаваўся на ўсё жыцце… Вось жахліва!..

Люстэрка перад Ядвісяй раптам затуманілася і пачало пакрысе прасвятляцца. Сэрца знерухомела. Першае, што ўбачыла — нос, цікавы такі нос — траха не грэчацкі! Потым — вусны, шчокі, вочы блакітна-зялёныя, бровы цёмныя, вытанчаны лоб, ільняныя валасы… Нарэшце Ядвіся пазнала гэтага чалавека! Яна імгненна перавярнула люстэрка, тры разы паражагналася і выбегла з лазні. Не заўважыла, як у апошняе імгненне пераццяла гэты твар болем ды пакутамі, скрывяніла аблічча.

— Вой, бачыла яго, пазнала, пазнала!.. — ледзь не крычала яна да дзяўчат. — Гэта Пранціш, Пранціш з Сухаволяў!

Пасля варажбы дзяўчаты разышліся па хатах, пераапрануліся ў святочнае, сустрэліся з хлопцамі дый пайшлі шчадраваць. Ядвісі на галаву пачапілі папяровы вянок з рознакаляровымі стужкамі. Яна была ўпэўненая і спакойная, бо ведала, што Пранціш, яе

* фасолі

Пранціш, будзе з ёю. Барвовыя шчочкі лёгка пакусваў мароз, прыгожы тварык свяціўся шчасцем. Яна ўжо і не згадвала тое сабачае выццё, што так перапужала яе перад варожбамі.

Наўкола скакалі, спявалі дзяўчаты й хлопцы. Аўген граў на дудцы. Хто-ніхто быў пераапрануты ў «мядзведзя», «цыгана», «жорава» ды «казу», якая час ад часу элегантна памірала пад гучны смех ды кепікі гледачоў. Калядоўшчыкі хадзілі па хатах, віталі й славілі гаспадароў, атрымлівалі пачастункі.

Абышоўшы ўсе хаты, шумны гурт падаўся за вёску і ля сажалкі сустрэўся з калядоўшчыкамі Сухаволяў. Завадатарам ішоў Пранціш. Вясёлы, расчырванелы, ён зірнуў на шчодру з суседняга мястэчка, сустрэўся з ёй позіркам.

Яны сталі побач ды заспявалі, скрыжаваўшы рукі:

*Іш-ла Ка-ля-да — з кан-ца ў ка-нец.*
*Зай-шла Ка-ля-да к І-ва-ну:*
*— Чым бу-дзеш да-рыць Ка-ля-ду?..*

Іх сэрцы ўтрапёна зайшліся ў віхурным суладдзі пачуццяў. Потым — гулялі ў «Жаніцьбу Цярэшкі». Калядная адвечнасць пазірала ў іх смарагдавыя вочы. Таямнічае сузор'е Калядаў дарыла ім сваю шчасную любасць, пераймала подых жарсці й кунегі, назапашваючы ў падарунак бязлітасны лёс. Быццам мядовы яблык, што наліваецца сокам, красуе да часу, а потым гніе за нядбайным гаспадаром.

Прамінула з дзесяцігоддзе… Адзінокая жаночая постаць канала над заснежанай магілкай, праклінаючы тое сузор'е Калядаў, што знявечыла ейны лёс і лёс каханае Радзімы. Муж выкінуўся з вакна, калі яго вялі на чарговы допыт і катаванні ціхмяныя служкі часу…

Недакаханы лёс зеўраў у чорным небе сваім бясконцым прадоннем.

## ЧАЦВЯРГОВАЯ АДПЛАТА

— Дабрыдзень, суседачка! — у хату зайшла жанчына, яшчэ не старая, але і не маладая далёка.

— Добры, калі не жартуеш, — адказала Юсця, амаль не зірнуўшы на суседку.

Юсця не любіла суседку, таму імкнулася выкінуць ведзьму Параску з галавы, проста забыцца на яе існаванне. Але забыцца

было немагчыма. Зноў ды зноў тая зводзіла чужых мужыкоў... Прыгожая была — да шаленства; насылала на дзяцей хваробы, сурочыла жывёлу. І зноўку ажывала старая рана: з-за яе памерла Юсціна дзіцё, з-за яе ледзь не кінуў жонку муж, з-за яе сама ледзь не загінула. Але апошнім часам нянавісць ды глыбокая няпрыязь мяшаліся з жалем. Цалкам паплацілася Параска за ўсе беды, што зрабіла людзям. Бацькі яе ад сораму памерлі, потым і дзеці — пяцёра бязвінных анёлкаў, адзін за адным. Апошні толькі застаўся, меншанькі. Нячысцік яго дзерганyў на карову узлезці, а тая вазьмі ды падыміся — і на рогі яго, і капытамі… Ляжыць, гаротненькі, не сёння-заўтра душою рыгне. А можа, ужо і няма яго, а то б чаго яна прывалаклася.

— Ды не да жартаў мне, Юсця. Годзе ўжо, павесялілася. Так павесялілася, што аж моташна цяпер, — Параска абаперлася на сцяну.

— Што, Янaчку твайму не палепшала? — усё ж імкнулася пераадолець гэтую няпрыязь Юсця.

— Дзе ж, чакай. Але хутка ўжо… хутка яму так палепшае, як нікому ў свеце, — яна заплакала, мабыць першы раз у жыцці.

Юсці ўжо б і хацелася супакоіць яе, але не прыхавала яна для Парaскі пяшчоты: не магла растуліць вуснаў ды сказаць штосьці суцяшальнае, не магла аблашчыць, даць выплакацца, што зрабіла б для якога іншага чалавека, але толькі не для яе.

— Ведаю, думаеш: з прыхамаццю да цябе прыйшла... Ніколі з дабром я не хадзіла, ні да кога. А перад табой, як ні перад кім, вінаватая. Думаеш, тады сваёй смерцю твой малы сканаў? Не, гэта я наслала на яго сурокі... Я! — Параска захлыналася слязьмі, захлыналася напаўвар’яцкім крыкам.

— Я ведаю, — суха мовіла Юсця, а ў душы віравала, сэрца шалёна тахкала, нібыта зноўку была зараз тая праклятая ноч, калі трымала састыглае целка адзінага дзіцяці на сваіх руках.

— Ведаеш? Чаму ж не помсціла?.. — Параска млела ад болю, ганьбы ды здзіўлення, не наважваючыся ўпасці суседцы на грудзі, а Юсця і не магла ёй гэтага дазволіць.

— Не хачу грэх на душу браць. Але чаго ты прыйшла, чаго зноў вярэдзіш мінулае?

— Крычы, бі... Хоць забі — усё мне мала будзе. На чужых дзяцей лёгка было сурокі насылаць, а свайго агоўтаць, відаць, не змагу. Усё перарабіла: замовы, шэпты, пітво ўсялякае — анічога не дапамагае.

— Сатаны ў табе шмат, Параска... Ён дабра не робіць. На дабро — Бог патрэбны, а ты яму не малілася ніколі.

— Твая праўда. Але хачу паспрабаваць да доктара, у горад. Калёсы мне патрэбныя, а ты ж ведаеш, мяне ніхто нат на парог не пусціць.

— А чаму ты так упэўнена, што я дам? — нават абурылася Юсця.

— Ты — добрая, ты — святая... — Парасчын голас зноўку гучаў ціха і суха. — А дзень такі, на любога падумаеш, што з прыхамаццю прыйшоў, на мяне — тым больш.

Юсця стаяла ў роздуме. Перад вачыма зноў пранесліся страшэнныя ўспаміны, якія жанчына ўжо які год дарэмна імкнулася забыць. Падумала і пра няшчасных Парасчыных дзяцей. Яна вагалася, але нядоўга.

— З прыхамаццю дык з прыхамаццю — тут Бог табе суддзя, а малое ні пры чым. Бяры калёсы, Параска, дай Божа, каб дапамагло толькі. А лепш — утаймуй сваю зайздрасць. Ад зайздрасці ўсе беды твае.

## РУСАЛЬНЫ СУМ

Якая ціш на возеры! Здаецца, прырода нават не дыхае. Дзе ж ты яшчэ ўбачыш харашынь такую?!.

Цьмяным недакучлівым святлом адбіваюцца ў водным люстэрку зоркі й месяц. А гэты водар хвояў!

— Як цудоўна сёння, праўда?

— Праўда, асабліва, калі каханая побач.

— Якая роўнядзь! — дзяўчына запляскала нагамі па вадзе. — Вось так! Ха-ха!.. — рэха дзявочага смеху пракацілася над возерам. — Трымай кветкі, яны мне перашкаджаюць, так шмат набрала… — Яна ўсхапілася і, не баючыся зваліцца, пачала гойсаць, нібы ў спаталяльнай агоніі.

— Ц-с-с-с! Не надта гарэзнічай, а то пачуе які вадзянік дый сцягне ўглыб за нагу.

Дзяўчына хуценька падціснула ногі пад сябе.

— Ага, спужалася… — ён адно хацеў пакпіць, але яна самаўпэўнена зірнула на яго, абвясціўшы, што не баіцца анічога.

— Ну, тады не круціся так, бо спарахнелая хвоя, на якой мы сядзім, можа абрынуцца ў ваду.

— Вой, я п’явак баюся!..

— Нарэшце! Хоць нечага ды баішся. — Ён наўзацмачкі, вельмі пяшчотна пацалаваў яе і раз, і другі.

Знячэўку пачуўся скульсьці жаночы голас, дужа прыемны. Здавалася, ці не з-пад вады. Хлопец з дзяўчынаю азірнуліся — нікога чыста. Пяшчотны голас паклікаў яшчэ раз: «Гэй!» — і тут яны заўважылі сярод чароту русалку. Сапраўдную. А такая прыгожая — акурат з пены марской. Сама Афрадыта! Здавалася, яна выпраменьвае магічнае святло.

— Гэй!.. Гэй, хлопча! Ідзі за мной! Ідзі! Ідзі!.. — русалка клікала, спакушала белай празрыстай скурай, вабіла раскошнымі ды акуратнымі, быццам вылепленымі з белага мармуру, грудзьмі, залаціста-срэбнай луской, што агнялётам разляталася вакол яе. Голас зачароўваў так, што немагчыма было не паслухацца.

— Хлапчына ўстаў, скочыў на ваду і пайшоў па ёй, што святы. Яго каханая спачатку ціхутка сядзела, бо ад страху не магла вымавіць ані слоўца, потым стрымгалоў кінулася ўцякаць. Бегма бегла, жагналася ды мармытала: «Матка Боская, злітуйся!.. Матка Боская, ратуй!..»

А хлопец, дасягнуўшы сярэдзіны возера, спыніўся.

— Ідзі да мяне, красуньчык, — русалка нечакана падхапіла яго ды пачала апантана цалаваць.

— Ён, зачараваны, зусім згубіў галаў — быў узаемны з ёй, пакуль ставала моцы, а потым — яна проста адпусціла яго ў нябыт…

— Ну чаму? Чаму мне няма паталення ад гэтага?!. — русалка моцна біла хвастом па вадзе і вар’яцела, гойсаючы па азёрнай шыры.

Сярод гэтага гвалту пачуўся голас:

— Палюбоўніца Антыхрыста!

— А, гэта зноў Ты! — русалка азірнулася, прагна дыхаючы.

— Зноў — Я!.. — на вадзе стаяў Чалавек са светлым колцам над галавой. — Да якога часу ты будзеш губіць чалавечыя душы?!.

— Покуль хочацца… А Табе — што за бяда?

— Ты хочаш, каб цябе кахалі, але што ты дзеля таго зрабіла?

— Што зрабіла?.. А хіба кахаюць за нешта?

— Безумоўна.

— Ха! Значыць, ты — мне, я — табе?

— У пэўнай ступені — так.

— А Ты думаеш, я не прасіла, каб верылі мне, спачувалі хоць

трохі… Я нават абяцала і аблічча русальчына змяніць! Я кахала іх усіх, але аніводзін не кахаў мяне! Кожны быў са сваімі забабонамі... Яны больш хацелі, каб іх з’елі ракі! Так што — з абменам ніяк не выходзіла. Вось я і не прыніжаюся болей.

— Табе трэба было толькі кінуць Антыхрыста.

— Ну дзякуй! І застацца зусім адной?

— Дык ты вырашыла, што можаш пазбаўляць чалавека жыцця, не даючы яму аніякага шанцу? Для спадара свайго шчыруеш?

— А хоць бы й для яго. Толькі ён мяне зараз разумее, хоць і не кахае.

— І Я цябе разумею. Заўсёды разумеў.

— Праўда? А што Ты мне параіў тады, калі я была дзяўчынаю? Маліцца і прасіць у Бога літасці?

— Так, Я казаў гэта. І зараз скажу. Але твой будучы каханак прапанаваў табе іншае выйсце — вір… І ты вырашыла кінуць Богу ў твар Ягоны дарунак? І што ты маеш з таго?

— А што б я мела тады — так несправядліва страціўшы каханага на бессэнсоўнай вайне?

— Ты б несла свой крыж!

— А ці ж не цяжка было б мне, слабенькай дзяўчыне?

— Я дапамог бы… Ты ж ведаеш, Я побач з кожным.

— Ведаю. Але шмат мне радасці з таго!

— Што ж, бяжы да свайго Антыхрыста, ён адорыць цябе радасцю.

— І пабягу! Толькі Ты не трапляйся мне больш на шляху. Дарэчы, Ты зноў забыўся, што я не магу Цябе бачыць — мы жывем з табой у розных вымярэннях. Таму ўсе нашыя сустрэчы — міраж. Ні ты, ні Бог, ні Антыхрыст не далі мне шчасця ані на зямлі, ані ў пекле. Дык што тады вечнае?.. Мой улюбёнец хоць не хавае таго, што няма таго шчасця, няма вечнасці, а Ты ж туманіш галовачку чалавеку марнымі надзеямі.

— Не блюзнер!

— А мне што? Я ўжо нічога не баюся, — вымавіла русалка ці то з горкай усмешкай, ці то са здзекам і боўтнулася ў свой вір, праз які яна звычайна трапляла ў пекла.

Чалавек глядзеў ёй наўздагон.

— Гаротная, дарэмна ты так. Дарэмна... — Ён ціха павярнуўся і пайшоў туды, дзе зямное сыходзіцца з нябесным. Сусвет займаўся на такі ж барвова-чорны, як і заўжды, адвечны й велічны золак.

## ПРАГА КУПАЛЛЯ

Дзень аджываў. Апошнія сонечныя промні ахутвалі агністым ланцугом вершаліны дрэў і запальвалі святочным бляскам аксамітныя травы. У паветры стаяў духмяны пах глебы й кветак. Гэта быў незвычайны, чароўны пах старажытнага паганскага свята. Здавалася, у ім памяшалася ўсё: мінулае, сучаснасць, будучыня, сонца і месяц, дзень і ноч, дождж і спякота, каханне і смерць…

*Купала на Йвана!*

*Да Йваначка, мой братачка.*

*Купала на Йвана…*

Спяваюць дзяўчаты, дабіраючы апошнія чароўныя зёлкі. У кожнай ужо ёсць па вянку і букеце з багатак, руты, валошак ды папараці.

— Дзяўчаты, годзе ўжо, хадземце на ўзлесак! Хлопцы, мабыць, вогнішча падрыхтавалі. Заводзь, Гарыслаўка, песню!

*У Кузьмы на дворачку…*

Заспявала ціхмяная Гарыслава — абранка сёлетняга купальскага кола. Прыгажуня якіх пашукаць яшчэ! Але чамусьці саромелася яна яшчэ сваёй прыгажосці, а мо проста не ўсведамляла яе — спявала ціха, рухалася няўпэўнена. Толькі няўпэўненасць гэтая выпраменьвала прыродную грацыю…

Абранка купальскага кола! Го!.. Яе вылучыла ўсё мястэчка як найпрыгажэйшую дзяўчыну. Значыць — ужо сапраўдная нявеста. Вох, наколькі адказная і шаноўная гэтая роля! Сэрцайка так і тахкае ў грудзёх, абіраючы імгненне, каб выскачыць і затанчыць у касмічным карагодзе. Усё ўсярэдзіне знямела, дух перацяла — яны падыходзяць да Лысае Гары, дзе чакаюць хлопцы. Зараз Гарыслава мусіць абраць сабе завадатара. Як зрабіць гэта, каго назваць?.. Раніцою ўсё паглядаў на яе Ян. З тутэйшых — ён самы лепшы хлопец. Гарыся даўно ўжо заглядалася на яго, але не магла сабе ў гэтым прызнацца, не магла зразумець гэтага новага для яе адчування… Дык чаго ж вагацца, калі сам не разумееш прычыны? Так, вырашана! Завадатарам будзе Ян!

Толькі што ж яно б’ецца так, сэрцайка? Вунь ужо і хлопцаў відаць, а сярод іх і Ян. На адно імгненне прыпыніў ён на Гарыслаўцы свой маркотны, здалося ёй, позірк і адразу ж адвёў вочы, быццам і не глядзеў. І чамусьці тут жа паспакайнела на душы ў Гарыславы.

Нехта з дзяўчат-сябровак заспяваў:

*Ну, ты, наша Гарыславачка,*
*абірай сабе завадатара!*

Упэўнена падышла яна да хлопцаў, паказала на Яна. І тут усе пачалі вадзіць карагод вакол купальскага вогнішча, запаленага ў тое самае імгненне, як толькі сонца схавалася за гарызонтам. На чале карагода ішлі Ян ды Гарыслава. Яна ўжо спявала смялей, раз-пораз пазірала то на агонь, то ў вочы Яну, быццам хацела ў іх штосьці разгледзець. А напраўду — чакала, калі ўсе пачнуць пускаць па рацэ вянкі й нарэшце можна будзе пайсці шукаць разам з Янам Папараць-кветку…

Вось ідуць яны па вузкай сцяжынцы, асветленай месяцам. У Янавай руцэ гарыць паходня, запаленая ад жывога купальскага вагню. Ён узяў яе з сабою, каб адпужваць усялякіх нячысцікаў, што так і гойсаюць па лясох у купальскую ноч. Але ім не страшна: яны ідуць поруч, закаханыя. Яны абралі адзін аднаго, яны кахаюць адзін аднаго! Як хораша на душы, як хораша навокал! Як цудоўна пахнуць хваёвы лес і папараць!

Поўнач. Ужо зусім не адчуваецца спёкі — проста цёпла, асалоднай вільгаццю пахне з дрыгвы. Здалёк яшчэ чуюцца спевы, але ўсё больш аддаляюцца ды неўзабаве сціхаюць. Толькі зоркі цвыркочуць у дрымоткай цішы, крышталізуючы мелодыю ночы. Недзе пракугікала сава — і раптам знік за хмараю месяц, падзьмуў моцны вецер. Затрымцела святло паходні, і Ян з Гарыславаю ўбачылі зіхоткія праменьчыкі, што прагна прабіваліся з-пад кустоўя папараці. Іхнія вочы на імгненне паслеплі ад незвычайнага святла, што пераліваліся ўсімі колерамі, быццам грала купальскае сонца. А святло тое сыходзіла ад зусім невялічкае кветачкі...

— Ян! Гэта ж — Папараць-кветка! Мы знайшлі яе! Знайшлі!..

— Любая мая Гарыська!

Яна адразу ж змоўкла, збянтэжана зірнула на хлопца. Іхнія твары былі асветлены цудадзейнай кветкай кахання, якое працінала наскрозь сэрцы яшчэ не зведаным, але прагна чаканым пачуццём. Іхнія вусны нясмела з’ядналіся ў гаючым палкім цалунку — трывалым і прыемным, як само жыццё.

І гэтае імгненне, здавалася, будзе доўжыцца вечнасць, якую надзейна ахоўвае маленькі купальскі дзядок.

# ІЛЛІЧОЎКА

Галляш любіў дождж. Ён бачыў у ім нешта роднаснае. Дзіўна, але часам у жыцці яго надараліся такія моманты, калі ён сапраўды адчуваў сябе Перуном. Яго так і празвалі: Пярун на дзявочыя сэрцы; падтрунькалі — Галляш нарабіў гнілля ж са слёз дзявочых. Так — ён, ветрагон, шалахвост.

Але вось ужо цэлы тыдзень Галляш штовечар ходзіць на возера, толькі на возера, толькі туды…

Неяк звечару вяртаўся ад чарговае ўкаханкі. Вяртаўся лесам, што раскінуўся паабапал невялікага возера. Які гэта цуд — лясныя вазёры! Ці то на беразе ты, ці то ў лесе — у царстве вадзяніка альбо лясовіка… Гэтыя няпэўнасць, пераходнасць, дрыготкасць стваралі такую ж імпрэсію, што і дождж, што і туман, што і мжа…

Галляш любіў дождж. І вось тады ён упершыню ўбачыў яе. Залева бізавала азёрную ласу, ад чаго вада таньчыла, нібы ў імбрычку. І яна плыла па гэтым пекле, па гэтай кіпкай смале, па гэтай навальніцы — сама, як навальніца, то падстаўляючы твар водным бізунам, пяшчотна і ціхутка порскаючы ад задавальнення і ягласна дыхаючы, то раптам давала нырца, плывучы дэльфінікам, то спрытна перакульвалася з жывата на спіну, са спіны на жывот. Ажно таласіла ўваччу. Яна нібы бегала па хвалях, нібы гулялася з Перуном у толькі ім вядомую гульню. І сярод гэтае таласы — смуглявае, аголенае, стромкае, гнуткае цела… Экстазнае відовішча! Цэлую ноч пасля Галляш не мог заснуць, цэлы дзень прайшоў як у трызненні, а ўвечары, нібы змагнусаваны, пайшоў туды зноў. Там зноў была яна… І так — штовечар. Надвор’е было адмысловае: удзень парыла, а ўвечары Белабог пратыкаў сваім посахам разагнаныя вятрамі хмары, а сын яго, Пярун, — дапамагаў громам і маланкамі. А яна, дзёрзкая, яна не баялася анічога, нібыта была іх сваячкаю…

І сёння нічога не змянілася. Заваражоны, Галляш зноў быў прыкуты позіркам да гэтага прыгожага цела, такога знаёмага і незнаёмага, блізкага і далёкага адначасна. Ён адзінока стаяў, прыхіліўшыся да старое яліны, ды ўсё наўзіркам пільнаваў сваю Лелю. Залева да шпіку прамачыла яго, дажджынкі струменьчыкамі збягалі па скронях, шчоках, сківіцах, шыі, грудзёх… Грудзі, як

дзіўна: ён ягласна бажаволіў яе цела, але не так, як іншых. Было боляча менавіта ў грудзёх! Пякучы сверб руйнаваў душу. Часам, калі ў галаве яго трошкі развіднялася, ён думаў: «Напса?»** Гэта ж ужо не ён! Гэта ж усё роўна, што ўявіць Дон Жуана мужам ды бацькам! Немагчыма! Проста немагчыма! Нішчылася ягоная сутнасць! Але боль, млоснасць, трызненне, магнус ды ягласць бралі сваё, і ён, што прывід, зноў ішоў да свае Лелі…

— Ну што ты ўсё там стаіш? — гукнула яна і паклікала да сябе рукою. — Хадзем купацца! Я абагомліваю купанне пад дажджом! Паспрабуй! Гэта знакаміта!

Яна яго бачыла і так спакойна плавала штовечар! Ён адразу адчуў сябе, нібы цяля ў Бога скраўшы.

— Дык што ж ты спужаўся? Ідзь да мяне! — Але ён мітрэнжыўся, вагаўся. І тады яна выскачыла з вады, як вецер падбегла — адным рухам змахнула яго апратку і зацягнула ў ваду. — Давай навыпераганкі! Спрачаемся, што не нагоніш! — з выклікам пракрычала, звонка смеючыся, і, адштурхнуўшыся ад яго нагамі, дала нырца.

Плавала яна адмыслова, але Галляш і не імкнуўся яе нагнаць, адно па-ранейшаму проста мілаваў вока. Вось да берага засталося недалёка, ён зрабіў апошні рывок і скамечыў яе ў абдымках. Здаецца, кожным атамам сваім адчуваў кожны яе. Уся прага, невыславёнае шчасце выбухнулі ў гэты момант агнялётам цалункаў! Яна паслухмяна паддавалася ягонай волі. Імгненне, адно толькі імгненне.

— Гэй, так хутка анічога на зямлі не робіцца. Плавымо назад.

Яе позірк і голас былі такія пяшчотныя, мяккія, лагодныя, што нельга было аслухацца. Яны ціхутка паплылі поруч, смакуючы прасвядную прысутнасць дажджу, які апладжваў іхнія сутнасці сакральным дарам кахання.

— Як табе імя?

— Ліля, Лілея.

— Буду зваць — Леля. Можна?

— Так… — І, нібы ўвушшу, зазвінела шчасна-таемнае: Так…Так…Так.

---

** Якога чорта?

## ІСПАСАЎКА

*Прыйшоў Спас — прыбярэ чорт і нас.*

Спіць зямля. Ціш. Спіць. Ціш-ш-ш, ціш-ш-ш… Наваколле спіць: чуйкае марознае паветра жнівеньскае ночы, зорнае неба Канта, шматлікія артэрыі дрэваў і сэрцы дамоў. Ціш. І водар яблыкавага плоду — таксама спіць, таксама ціш. Гармонія ўсяго і нічога. Ледзь адчувальныя павятровыя хвалі люляюць малекулы яблыка, таго самага, што засеў у горле Адама. Салодка-горкі водар, водар няздзейсненага лёсу, нечага няспраўджанага, падманутага, салодка-горкі, як любая пакута. І настолькі моцны й трывалы (як любая пакута), што, здаецца, прасяк бы кожную клетачку чалавечае істоты, калі б дзе-небудзь непадалёк знаходзіўся чалавек. Ад яго звар'яцееш умэнт, нібы ад стогнаў мандрагоры — толькі высунься з хаты, бо ён, паўсюдна: пах лёсу. І нават зусім не крывавы ён, не смяротны — гэта проста пах лёсу, як прывід ці як Бог: усе ведаюць, што яны ёсць, але ніхто іх не бачыў. Што яно? Дык што ж яно? Проста — празрысты, эфемерны пах лёсу. Душы памерлых дзецянятаў, маткі якіх елі яблыкі да Спасу, кружляюць па-над гэтым першасным дрэвам-яблыняй, як восеньскія лісты й нема канькаюць сабе яблык. Іх розгалас нагадвае лямант патаптаных кветак. Вар'яцтва нечую хворую свядомасць прымушае вымалёўваць прадрэва, адзінае да цяперашнягя часу. Чыю свядомасць? Хто вакол нас? Дзе? Здаецца, вакол нас існуюць толькі пытанні й ніводнага адказу. А мо і не здаецца. І зноў жа — каму?

Чалавецтва, якое даўно падавілася, у ноч на Іспаса прысніла надкусанае сэрца…

## БАГАЧЫК

Дзе, калі, куды, адкуль, як, навошта і чаму? Гэта школьніцтва… Школьніцтва нашага жыцця. Сацыяльны статус? Гэта важна? Пэўна. Але толькі пасля таго, як усвядоміш, навошта Бог запхнуў цябе на гэтую зямлю. Тады ўсе намаганні павінны набыць патрэбны кірунак. Іначай, жыццё прапыхкае дарма. Вось яно, адлятае буслом і ўжо курлыкае табе развітальную песню: «Пражыў, не зразумеў, згарэў». Дагані яго, затрымай! Затрымай! Але не… Яно ж не дало табе права, волі й моцы на апошні скачок, каб схапіць яго за

ўкеўзаны хвост. І тут затуляеш твар рукамі. Сорамна. Толькі цяпер заўважаеш, як забрудзіў сваё жыццё. Вой, як сорамна! Забрудзіў нядумкамі, нярухамі, неразуменнем. І ты надзяеш маску, каб не паказаць продкам чырвонага твару, вінаватых вачэй: яны зразумеюць без слоў, што бачыў ты ў свой апошні час. Яны прамовяць: «Ганьба, дзіце». А ты не разумееш іхняе мовы! Што яны кажуць? Што? Як гэта важна для цябе зараз — зразумець іх… Зразумець — і пайсці наверх альбо наніз. Куды ісці? Куды? Скажыце! Мо — налева ці направа? А мо — пад вуглом у трыццаць сем градусаў ці ў семдзесят тры?.. Ты хочаш ісці — хоць куды, але дужыя рукі не пускаюць наперад. Не твой шлях. Кожнаму — сваё. Дык куды ж? «Ганьба, дзіце!» Неразуменне ўжо закладвае вушы, прэ з цябе, як ваніты, налівае цяжарам ногі — і вось ужо сам не можаш рухацца. Боль страшэнны прымушае жадаць смерці. І ты жадаеш, жадаеш, жадаеш…

Ха-ха. Мой любы Тантале. Дык… мёртвыя ж — не паміраюць. Хочаш выплюнуць трон? А хто ты такі? Ты зразумеў гэта там? Табе быў дадзены плод спасціжэння. Што зрабіў ты з ім?.. Вось бачыш, насыціў чэрава, забяспечыў унукаў. І, відаць, надта добра — іх няма на тваёй магіле, цябе няма ў іх думках.

Дык вось — чакай. Зразумееш толькі тады, калі ўхопіш яблык. А ўхопіш тады, як зразумееш… Ха-ха… Немажліва? Мажліва, мой любы Тантале. Можа, калі-небудзь твае ўнукі добра папрацуюць ды атрымаюць багаты ўраджай яблыкаў. І тады адна галінка ад цяжару, нагнецца ніжэй звычайнага… І будзе пярэкрут.

А пакуль – вучы табліцу множання:

— Дзе? — У любові.

— Калі? — Падчас любові.

— Куды? — У любоў.

— Адкуль? — З любові.

— Як? — Любасна.

— Навошта? — Дзеля любові.

— Чаму? — Праз любоў.

## ЗВІЖАНСКІЯ ВУЖАКІ

Апошнія сонечныя промні. Цёплыя-цёплыя. Цяплюткія… Прырода грае, дрыжыць усімі колерамі. Барва, золата, зялінка… Дражняцца. Нібы ў міражы сплываюць фарбы. Наркатычны пах

ляснога адмірання. Гарачая пара патыхае ў ногі, шоргае пад імі апошняе золата пяшчоты. Потым — восень схавае сваё цяпло пад зямлёй, замкнуўшы на сто засавак ды аддаўшы ключы птушкам у вырай... Містычнае, дрыготкае паветра, якое бывае толькі ўвосень. Як над вогнішчам, калі згарае сум мінулага часу і рэшткі сухіх расцін. На велізарныя глыжакі выпаўзаюць грэцца клубкі гадзюк. А сярод іх — цар іхні з залатымі рожкамі на галаве…

Шматкроць чуў гэтую легенду Толік ад сваёй бабці. Гвазданi цара таго папліскаю, схапі рожкі — і ўсе дзверы свету будуць для цябе адчыненыя. Толік трызніў на тыя рожкі з дзяцінства. Гэта ж меў бы ён тады ўсе цукеркі, што замыкалі ў куфры бацькі. І не толькі цукеркі — шмат іншых цікавых рэчаў, што былі добра замкнутыя дарослымі ад яго цікаўнага вока. Асабліва спатрэбіліся б рожкі цяпер — калі Толік адмысловы злодзей. Хлапца лавілі па ўсёй краіне, але ён быў нібы няўгледкам. Ён мог сцібрыць заўсёды і ўсюды. І сысці незаўважаным. Была адна праблема: засаўкі. На іх марнатравіўся час, якога Толіку было вельмі шкода. І не тое, каб яму былі патрэбныя тыя рэчы — яго захапляў сам працэс! З дзяцінства засталося гэтае шчымліва-цікаўнае жаданне: прасякнуць туды, дзе зачынена, дастаць таго, што забаронена. Дык вось бы яму цяпер тыя рожкі!.. Як было Толіку пятнаццаць — разбіліся ў катастрофе бацькі. Яго забрала да сябе бабуля. Але хлопец пайшоў на вуліцу, дзе і засвоіў усе яе ўрокі на выдатна. За дзесяць гадоў ён ні разу не быў на могілках; наладжваючы ў хаце гармідар, забываўся, што праз сцяну затыхаецца ад п’янога чаду ці п’е сардэчныя лекі бабулька; яго начныя паненкі гаспадарылі на кухні, а Толік — мог і кулаком гвазданууць. Калі яго пачалі лавіць — Толік сышоў зусім. Ён быў няўгледкам. Чалавек-цень. Без сям’і. Без каранёў. Без сумлення. Праўда за пяць гадоў уцёкаў пасля кожных чарговых похмелкаў яму ўсё часцей хацелася завыць на месяц, сеўшы на глыжак. І яшчэ хацелася б ведаць, ці жывая яшчэ бабульця. Але ён не мог зняць трубкі й патэлефанаваць. Ён баяўся, што забыўся на хатні нумар. Але ж і пра рожкі марыў усё роўна. Спадзяваўся, што яны адкрыюць яму дзверы памяці.

А тут — ён яшчэ ўбачыў Яе. Паненку з кавярні. Яна разносіла стравы, як Мадонна (ён чуў калісьці ў школе, што гэта была самая прыгожая жанчына). «Напэўна гэта і ёсць каханне», — падумаў ён, калі ўсе папярэднія сяброўкі падаліся яму блудніцамі.

Яна ж — была толькі багіняю, якая павольна плыла па дымных хвалях кавярні. Яна звонка смяялася ягоным жартам, ахвотна прымала падарункі й кветкі. Але з усім Толікавым зладзейскім талентам ён не быў ёй патрэбны. Гвалціць Яе — у яго і ў думках не было. Яна ж была Мадоннаю! Але як па-іншаму — ён не ведаў. Ён прыгадваў пяшчотныя цёплыя рукі бабулі, глядзеў на свае — яны вылучалі толькі холад. А ў душы так пякло каханне, што ён пачаў нават марнець. Гэтае вогнішча было, нібы замкнёнае ў ім, не магло прарвацца па капілярах ды нервах ва ўсё цела. Пэўна гэта і стрымлівала Мадонну. Прынамсі, яму так здавалася. Вось тут яму зноў закарцелі тыя рожкі. Яны адкрыюць яму дзверы памяці.

І Толік ужо шоргае нагамі апошняе золата пяшчоты, восені. Дражняцца фарбы: памаранж, салата, бездань. Наркатычны пахляснога адмірання. А гэта — запаветны міраж: вялізны глыжак, на ім — цар гадзюк, на ім — залатая карона з двух рожак. А блішчыць, ззяе наўкола — як другое сонца. Слепіць вочы. Спрытна гвазданууў яго Толік палпіскаю — кроў пырснула ў твар. Ён напужаўся, але ўбачыўшы, як пляснуўся гэты цар долу, падумаў: «Зрэшты — усяго толькі гадаўка». Ён падхапіў рожкі й пабег з лесу. Туды, дзе гула лятучка. Вось, як лёгка: прыйшоў, убачыў, перамог.

Стаўся сапраўды залаты час для Толіка. Перад ім расчыняліся ўсе дзверы, як толькі ён прасоўваў рожкі ў засаўкі. З кожным днём усё больш прыхільным рабіўся позірк Мадонны. А неяк аднойчы, Толік паказаў ёй рожкі й дзеля смеху правёў імі па сцёгнах Мадонны. І дзверы памяці растулілі яму свае абдымкі!

Залаты, шчасны феерверк экстазу абліваў яго скамянелую душу. Яе растаплялі насалода і пяшчота. Любасць і ўтрапленне…

Вар'яцтва і крык… У цёплым пяшчотным ранку, ва ўтульным мяккім ложку — ляжала на посцілцы побач з Толікам гадзюка. А на галаве ў яе — блішчэла, як сонца, залатая карона. Ён схапіў рожкі — гадзюка знікла, як і не было. Раптам нешта боляча апякло рукі. «Карона!» — згадаў Толік. Але зірнуўшы на рукі, убачыў там толькі два невялічкія адаманты расы. Ад страху заматляў рукамі, хочучы змахнуць расу. Дык яна ж, як прыклеілася! Гадаўка! Гадзюка!.. І ўсё боляча пякла рукі. На імгненне падаліся адаманты вачыма бабулі, поўнымі слёз, і — загарэліся.

Толькі горстку попелу і маленькія залатыя рожкі ў ёй знайшлі наступным ранкам тут крыміналісты.

# АЛЕНА СЯМЁНАВА



*Родилась в Минске. Было это 25 июля 1981 года. Закончила школу № 73 с углубленным изучением немецкого языка.*

*В 1999 году поступила на переводческий факультет МГЛУ, где сейчас и учусь.*

*Любое событие, задевающее мою душу, мои мысли и чувства, находит отражение в стихах, которые я сочиняю. Это, можно сказать, моя душевная необходимость, подпитка светлой энергией моего творческого духа.*



## БЕЛАРУСЬ

Просторные леса,
голубизна озер спокойных
и переливчивые голоса
прекрасных птиц,
живущих вольно.
Полей живое разнотравье
и теплый вечер у реки,
и зеленью манящие дубравы,
и пестрые цветочки-мотыльки.
Все это ты — родная сторона,
как теплый летний день, неповторимая.
Светла, как солнце, как луна — нежна.
Ты в мире этом самая любимая.

* * *

Ветер деревьев вершины колышет,
звездную пыль рассыпая во мгле.
Ночью мой крик здесь никто не услышит.
Может, лишь филин мне ухнет во тьме.

Старые сосны стоят, словно воины,
ветви протянуты в синюю ночь.
Снегом усыпаны, ветром напоены,
зимний не могут свой сон превозмочь.

Лес очарованный, сном заколдованный,
месяца светом жемчужным облит.
Снега оковами нежными скованный,
тайны свои вековые хранит.

А над лесной тишиною раскинулось
небо бездонное, полное звезд.
Если летать бы могла — сразу ринулась
я в тот волнующий мир звездных грез.

* * *

Вечер.
На столе горит лампа.
Вечность.
За окном дремлют звезды.
Разум.
Мыслей светлая рампа.
Счастье.
Быть с ним вместе не поздно.
Вижу.
Вижу твой образ —
я его не забуду.
Слышу...
Слышу твой голос.
Он звучит во мне всюду.
Чувствую
твои нежные руки,
жарких губ поцелуи.
А в душе моей —
муки разлуки.
Нашей встречи с тобой
снова жду я.

* * *

Жизнь идет, бежит, несется...
Я шагаю бодрым шагом.
Остро в сердце отзовется
грустный факт: тебя нет рядом.
Я одна — и хорошо мне,
потому что я живая.
Кто-то смотрит взглядом томным —
я молчу, не отвечаю,
потому что сердце греет
мне чудесная отрада.
Надо мною нежность веет...
Лишь твоей любви мне надо.

* * *

Капли света в глазах —
может, это слеза
или тайная боль,
что все время со мной?
Этот грустный мотив
боль в душе разбудил.
Боль моя не прошла,
вновь она ожила.
Если это — мой крест, — понесу,
словно платья росу
на восходе зари,
на груди у земли.
Если это — мой крест,
если это — мой грех, —
я пройду до конца,
до Христова венца.

* * *

Серое утро глядит хмурым глазом.
Я просыпаюсь, хотя и не сразу.
Ветер усталый тихо на крыше
спит, отдыхает, забравшись повыше.
Солнце, за облаком спрятавшись робко,
мягкий свой луч не покажет. Уловка!
Светлая солнца невинная шутка.
Нет его — мрачно мне стало и жутко.
Как я хочу, чтоб оно все ж проснулось,
с неба взглянуло и улыбнулось,
чтобы меня залило теплым светом
и мне надежду вернуло с рассветом.

* * *

Холодные звезды парят в вышине.
Я слышу смеющийся голос извне.

В заоблачной дали несется вперед
бессмертных мерцающий душ хоровод.
Сверкая, искрится небесная пыль.
Вселенная дарит им вечность и быль.
Горят облака, жидкой сталью льет небо.
И Моцарт загадочно смотрит и нежно.
Разряженный воздух живительно свеж,
страданий в нем нет и не нужен мятеж.
Легко и свободно летит там душа,
овеяна светом, чиста, хороша.

* * *

Жду письма. Живу, надеясь
на бумажное свиданье.
Огорчаясь, мыслью греясь,
что не вечно расставанье.
Эти белые листочки
с почерком твоим любимым
превращаются в цветочки,
что в душе цветут красиво.
На конверте вижу адрес —
и душа моя ликует.
Не понять тебе, как надпись
эта счастье мне дарует.
Сдержанность твоя и ревность
больно ранят мое сердце,
ведь ненужная суровость
не откроет счастья дверцу.
Голубой твой лед растает
и потоком станет бурным...
И весна в душе настанет —
нежной заблестит лазурью.

* * *

Цветы, застывшие в дыхании зимы,
влекут к себе холодным ароматом.

К чему они? Здесь пир среди чумы —
на этом жизни празднике проклятом.
Все опошлив, ликуют люди,
отравленные ядом удовольствий.
Увидим вскоре, то ли еще будет...
Как свиньи, ходят в сытом их довольстве.
Везде сорняк, но тонкому любви ростку
и белой лилии надежды
расчищу я дорогу, помогу
им пышно зацвести, как было прежде.

## ВЕЧЕР

На темно-синем небе
бархатно светят бриллианты звезд.
Неслышно проносятся кометы,
как бы невзначай задевая их хвостами.

## СОЛНЦЕ

Словно яркий фонарь,
светит оно с высоты неба.
Дарит живительное тепло
и жарит тела на пляжах.
Доброе и злое,
стоит оно в кажущемся бездействии,
пролетая сотни тысяч километров
в глубинах галактики.

* * *

Чем больше я пишу,
тем больше света в моей голове,
тем просторнее мыслям.
Тем ярче и шире луч,
светящий мне из космоса.

## ПТИЦА

Ворон, поблескивая черной сталью
крыльев,
величественно парит в небе,
Смотрит на землю сверху,
на ничтожность людей
и суетность их забот.
Немногие из них могут понять
вечность.

* * *

Счастье не вечно,
вечны страдания души,
стремящейся к свету.
Пройди их — и тебе
откроется новый мир,
где гармония и свет
дадут тебе покой,
но не счастье.
Счастье ты можешь
приобрести сам.
Слушай голос своего сердца,
и ты поймешь, как его найти.

* * *

Цветы, нарисованные луной на земле...
Они не пахнут, но красивы.
На них, любуясь в тишине,
души я слышу переливы.
Померкли звезды, грустно светит
с небес поблекшая подруга.
Ах, почему все так на свете?
Зачем не любим мы друг друга?
Обнявшись, не сидим украдкой
на лавочке в приморском парке.

Не замирает сердце сладко,
рассудок от любви не тает.
И в упоительном забвеньи
слова не шепчут страстно губы,
и равнодушно настроенье...
Зачем не любим мы друг друга?

* * *

Любовь — загадочное слово.
Моя душа к нему готова.
Судьба зовет меня с собою
волшебной сказочной мечтою.
Лететь согласна вслед за нею,
от предвкушения я млею
любви небесной, ясно-чистой,
такой заоблачной и близкой,
как лебедя перо, воздушной,
неискушенной, прямодушной,
на алых парусах летящей,
слова надежды мне шепчащей,
Открытой, пламенной, горящей,
пылающей огнем бодрящим,
огромной, сильной, вездесущей,
чудесным голосом поющей,
красивой, робкой и наивной,
словно улыбка пилигрима,
и страстной, алчущей и жгучей,
таящий дух в себе могучий.
Хочу купаться в море счастья
и чувствовать твои объятья,
и окунаться с головою
в любовь, и быть всегда с тобою.

* * *

Разврат и пошлость, пошлость и разврат.
Погрязли люди в наслажденьи...

И, ухмыляясь, повторяют тысячи чертят:
«Они находят в удовольствии забвенье».
Похабно устремился наглый взгляд
и руки жадно протянулись,
и губы пошло так твердят:
«Мадам, вы мне сегодня приглянулись!»
И вот испита уж до дна
изрезанная чаша наслажденья.
На сердце — лед, в душе — вина
за те развратные мгновенья.
И не мгновенья — целый век,
эпоха кровью красной плачет:
топор отточенный, железный дровосек
занес над головами... Люди платят
за удовольствия неслыханной ценой —
теряют суть, и навсегда
обречены быть лишь одной
неполноценной частью, неудачной.

* * *

Разверзлась пропасть —
зияет пастью.
Земли суровость
молчит, не плачет.
Открыла глотку —
зовет беззвучно.
Чернеет кротко,
но падать звучно.
Вниз нет ступеней,
лишь корни древа
ведут степенно
в темницу чрева.
На дне холодном —
стол из гранита;
на нем первородный
грааль из нефрита.

Таинственно светит
огнем он зеленым.
Кто выпьет — ответит
пред Господа троном.
Вся мудрость богов
и бессмертия вечность
хранит без оков,
а вокруг — бесконечность.

* * *

Тонким лучем выжигает
солнце золотые нити
в изумруде листьев.
Сапфиром синеет небо.
Цитриновый одуванчик
качает пушистой гривкой.
Я очень хочу его погладить...
Но как мне погладить воспоминание?

* * *

Золотой туман.
Мириады звездной пыли.
Голубой обман —
свет луны в эфире.
Эльфы в легких тканях
из цветов болотных
бледным ликом манят
из миров неплотных.
Крылышком ажурным
встряхивают нежно
и летят, искрятся
в океан безбрежный.
Над селом и лугом
стайкой пролетают
и волшебным кругом
постепенно тают.

* * *

Людская злость смешна
и до того нелепа,
что грош ей ломаный цена.
Не жди ответа
на добро. За теплые слова
не ожидай награды.
Твори добро, не думая сперва:
вершить иль не вершить, а будут ль рады
люди? Зависть и поклеп
поганой вместе ходят парой.
Предатель, кто б ни был — холоп
с паскудной и продажной харей.
И никогда не быть ему
по-настоящему красивым,
ведь за продажность никому
еще судьба подарки не дарила.

* * *

Подлость с сладенькой улыбкой
шепчет голоском елейным.
Правды мелкую ошибку
раздувает. Параллельно
козни строит, мелко гадит,
а в глаза глядит медово...
И предаст, и суд наладит —
честность осудить готова.
Погоди, завистник гнусный, —
мелкая твоя душонка
куш получит, лопнет с хрустом
и в обрыв сорвется звонко.

* * *

Цвела сирень.
С густым тяжелым ароматом

свисали гроздьями бутоны.
И пологом несли богатым
тягучий шлейф, таинственный и томный.
Река блестела в лунном свете,
лениво волнами плескала.
Ах, лучше нет на этом свете
весны благоухающего бала.

# СТЭЛА ФЯДОСАВА



*Поэзия — это незаживающая рана, это любовь. А любовь и красота — пробуждают в нас чувства, эмоции, разум. Затрагивают душу, исцеляют, ранят...*

*Это все — поэзия, и я в ней. Я — одиночество.*



## СНЫ

* * *

*Любимым посвящается*

Я шла пешком
по темным лужам.
Я их не знала глубины.
В одних — песок,
в других — ракушки,
что режут пятки до крови.

Я так от этого устала,
что лужи стала обходить.
Но все же интересно стало:
как раны старые лечить?

Мне подсказали: сшей сандалии,
шестом промеряй глубину...
И странно — лужи безразличны стали.
И раны — будто зажили.

* * *

Как приятно, что все мы — разные:
кто-то любит, а он — не ждет;
кто-то жизнь ведет развязную,
а потом — болеет и пьет;
кто-то плачет, но нет платка;
кто-то знает, но это — не я…

* * *

Мне так хочется
просто пить с тобой чай.

Одиночество,
уходи, прощай.
Мы пойдем с тобой
туда, где лес.
Где подснежники —
как глоток небес —
голубые и белые.
Я покажу тебе.
Только я их видела.
А теперь — и мы.
Мы ведь добрые —
не сорвем цветы.
Мы ведь вместе —
только я и ты.

* * *

Давай — не будем ссориться,
по пустякам ворчать.
Я прогоню бессонницу —
и буду крепко спать.
Как многое меняется —
и жизни смысл всей,
когда вдруг понимаешь,
что нет Его важней:
ни света и ни воздуха,
и даже — ни воды...
А очень это просто все —
люби Его, храни.

* * *

Добрый и хитрый.
Мудрый — земной.
Маленький доктор
с седой бородой.

Грустный немного —
глаза выдают.
Курит все время;
любит свой труд.
Будьте здоровы.
Живите сто лет.
Ваш сохраню я совет:
буду добра я
и к людям терпима;
в себя я поверю...
И буду любима.

* * *

Знаешь, какого цвета
уверенность в себе?
Не знаешь, где искать ответа?
Я подскажу его тебе:
цвет — голубой,
коль хочешь — синий, —
вдыхай его, ищи везде
цвет неба, моря
иль просто — вот эти
буквы на листке.
Коль не нужна
тебе уверенность —
другие качества важны:
найди им цвет —
и насыщайся:
люби себя, люби…

* * *

Две недели до весны —
как же это здорово!
Март — ручьи, весна, дожди,
солнце, небо синее;
запах свежести и новизны,

мысли добрые, стихи...
Как же это здорово!

* * *

Зачем она живет,
эта странная девочка?
Чего от жизни ждет?
Не выходит, спряталась...
Зачем таблетки ест?
Думает, забудется,
что у нее есть
бумага и ручка...
И что это дает?
Жизнь ее — фантазии.
